Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нашпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нашпарэлі наперад тэксту 1 р. — к. За радок нашпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвяшчэнныя на 50 проц. дарожэй. Зьнім тарыфу бярэцца 10 проц. ніжэй.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт 35 кап. За кожны дадатковы 15 „ Воспрацоўк. і чарнавікаваньня за дакумэнт 15 „ За кожны дадатковы 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газэты, на ўсіх аддаленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 77 (2265) Субота, 31-га сакавіка 1928 г.

„Тронная прамова" польскага фашызму.

Пілсудскі пераможан.

Дэманстрацыя, наладжаная левай фракцыяй польскага сойму ў часе яго адчыненьня, нічога добрага для ўраду Пілсудзкага не гаварыла. Левая дэманстрацыя была толькі пачаткам барацьбы з польскім фашызмам, якая ўвесь час вядзецца радыкальнымі элемэнтамі Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Нічога падобнага не чакаў польскі ўрад. Усе ўрадавыя газэты напярэдадні адчыненьня сойму, падкідваючы магчымыя галасы, якія будуць пададзены за кандыдатуру Бартэля ў маршалкі сойму, знаходзілі, што яму забясьпечана пераважная большасьць дэпутацкіх галасоў.

Так, напрыклад, газэта «Кур'ер Віленскі» ад 27-га сакавіка г.г. піша:

„Мяркуючы па характару гэтых груп (блёк нацменшасьцяў, сялянскі саюз, хадэкі, пяст і эндэкі) можна было-б спадзявацца, што яны прыхіляцца хутчэй на бок кандыдата адзінкі, чымся прадстаўніка ППС. Цяжка сабе ўявіць, каб па-за эндэцкім саюзам, які праўдападобна ў сваім канчатковым розыгрышу ўмые рукі праз укладаньне белых картак, і часткаю блёку нацменшасьцяў, гэтыя групы падтрымаюць сацыялістычнага кандыдата проці заслугоўваючага давер'я маршалка Пілсудзкага. Цяжка сабе ўявіць, каб пасеў апошніх 2-х гадоў ня даў так пажаданага для грамадзтва выніку, для супрацоўніцтва сойму з урадам".

Выпла наадварот. У маршалкі сойму прайшоў дэпутат Дашынскі (ППС), якога польскія ўрадавыя колы лічаць непажаданым для магчымага супрацоўніцтва з урадам. Аказалася, што пілсудчыкі задарма авансам урачыставалі. Перадвыбарчая кампанія ў польскі сойм была непарыўным ланцугом забойстваў, арыштаў і правакацый супроць апазыцыйных кандыдатаў. Пілсудскі выкарыстаў усю магутнасьць [illegible] для таго, каб за[illegible] перамогу на выбарах. [illegible]язкова патрэбны быў [illegible]. Пілсудзкаму ў асобе [illegible]ханізм, які абавяз[illegible]ы і ўхваляў усе яго [illegible]

[illegible]а тое, што выбары ў [illegible]ыстаны для навучэньня [illegible]іцы ўсім навейшым [illegible]як паказала першае [illegible]льскага Сойму, Пілсудскі дасягнуць перагo, як прыняць пад увагу той факт, што ўрадавы блёк атрымаў свае галасы ў выніку лютага тэрору, мы в поўным правам павінны разглядзець вынікі выбараў у Сойм, як рашучае паражэньне ўраду Пілсудзкага.

Першае пасяджэньне Сойму паказала, што Пілсудскі ня мае ніякага намеру лічыцца в воляй Сойму, в воляй тых міліёнаў польскіх грамадзян, якія галасавалі за апазыцыйныя кандыдатуры, але і першае пасяджэньне паказала, што абурэньне ў Польшчы палітыкаю Пілсудзкага дасягнула таго ўзвышша, пры якім апазыцыйныя партыі—пэпэас, Вызваленьне і інш. адважыліся ўступіць у бойку з Пілсудзкім і асароміць яго на вачох усяго дыплёматычнага корпусу, які ў гэты час знаходзіўся ў соймавай залі.

Мы ніякіх асаблівых надзей не ўскладаем на новы Сойм. І пэпэас, і Вызваленьне і ўсё інш. польскія партыі вялі, і будуць весьці палітыку прыгнечаньня польскіх працоўных мас і нацменшасьцяў, якія ўваходзяць у склад польскае дзяржавы. Адхіленьне запытаньня Украінскага Клюбу наконт сыстэмы тэрору, які ўжываўся ўрадам у часе выбарчае кампаніі ў Заходняй Украіне, той факт, што соймавай фракцыі Беларускай Грамады ня было дададзена слова для таго, каб напомніць аб нячуваным прадвыбарчым тэрору, які ўжываўся ўрадам у выбарчых акругах Заходняе Беларусі,—гаворыць нам аб тым, што ў адносіне да нацыянальных меншасьцяў палітыка і адных і другіх будзе аднолькавая.

Але з гэтага інцыдэнту трэба зрабіць належныя вывады: **рэжым Пілсудзкага можа трымацца толькі тэрорам.** Урад Пілсудзкага імкнецца зрабіць Сойм паслухмянай зброяй для сваёй палітыкі, але на гэтым шляху сустракае перашкоды з боку апазыцыйных дэпутатаў. Пілсудзкаму вусім непатрэбны парлямант: яму патрэбна парляманцкая камэдыя, для канстытуцыйнага афармленьня фашысцкага рэжыму.

Рэжым пілсудчыны ёсьць рэжым фашысцкага тэрору, накіраваны супроць польскіх рабочых і сялян, супроць Заходняй Украіны, супроць Заходняй Беларусі. Усе гэтыя элемэнты адкажуць на фашысцкі рэжым яшчэ больш моцным згуртаваньнем сваіх працаў аб разброеньні і імкнуцца ў агульнай згодзе да ажыцьцяўленьня разброеньня».

Штрэзэман сьцьвярджае, што **гэтыя ўрачыстыя словы зараз праз 2 з пал. гады ўсё яшчэ застаюцца пазбаўленымі ўсякага рэальнага зьместу.**

Штрэзэман падкрэсьлівае, што, не зважаючы на такое становішча, ён усё-ж такі адмаўляецца лічыць пытаньне аб разброеньні ў Лізе Нацый канчаткова пахаваным хоць-бы ўжо затым, што Ліга Нацый ня можа і не павінна адмовіцца ад вырашэньня гэтага пытаньня. Слова зараз за кіруючымі ў ваенных адносінах дзяржавамі. На іх ляжыць адказнасьць, на іх зьвернуты вочы і чаканьні ўсіх народаў. Я выказваю цьвёрдую надзею, што гэтыя чаканьні ня будуць ізноў ашуканы, і што ўжо на наступным сходзе рады Лігі мы будзем мець канкрэтныя эфэктныя пастановы. Калі я, не зважаючы на няўпэўненасьць і расчараваньне, усё-ж такі кажу аб надзеях і давер'і, дык мае вочы ў першую чаргу зьвернуты да вялікага магутнага народу **Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў.** Я вітаю думку аб агульным спакоі, вітаю зьвязаную з гэтым ініцыятыву згоды між эўрапейскімі дзяржавамі і народамі.

...ньне ў нанкінскім войску.

29-III. Газэта «Хоці» па[illegible] з Шанхаю, што 36 кор[illegible]скага войска, разьмер[illegible] праві́нцыі Цьзянсу, узь[illegible] проці Чан-Кай-Шы і ад[illegible]йсьці ў паход на поў[illegible]ная рада нанкінскага [illegible]адала 13-му і 32-му кар[illegible]ступіць проці войска, [illegible]шыла дысцыпліну.

З райёну непакояў шмат хто ўцякае ў Шанхай.

* * *

ЛЁНДАН, 28-3. У палаце вобшчын Чэмбэрлен на запытаньне, ці спынены перамовы з нанкінскім урадам наконт „нанкінскага інцыдэнта" заявіў, што перамовы яшчэ ня маюць спрыяючых вынікаў, аднак ён ня трапіць надзеі, што перамовы скончацца згодаю.

...гонскае войска разьбіта камуністамі.

...ДАН, 29-3. *Ганконскі карэспандэнт «Дэйлі Мэйль» ...не, што камуністычнае войска разьбіла войска кан... ўраду і захапіла горад Гуйлай у 45 кілёмэтрах ад ... Частка ўрадавага войска далучылася да камуністаў.*

„Дзелавая" праца польскага сойму

Замірэньне пілсудчыкаў з соймам?

ВАРШАВА, 29-III. Блёк супрацоўніцтва з урадам пастанавіў узяць удзел у дзелавой працы сойму і дэлегаваць сваіх членаў у камісіі сойму.

У сёньнешнім пасяджэньні сойму выступіў віцэ-прэм'ер Бартэль па пытаньні аб часовым бюджэце. У спрэчках аб заяве Бартэля выступілі пэпэсавец Марэк і прадстаўнік УНДО.

Перад выступленьнем запісаных на чарзе камуніста Варскага, прадстаўніка левага сельробу Вальніцкага і прадстаўніка украінскіх радыкалаў — спрэчкі былі спынены.

Пэпэсаўцы імкнуцца абмеркаваць выступленьне Бартэля, як адзнаку «замірэньня ўраду з соймам».

Часовы бюджэт у...

ВАРШАВА, 30-3. Польскае тэлеграфнае агэнцтва паведамляе; «Позна ўночы бюджэтная камісія сойму ўхваліла ў трэцім чытаньні часовы бюджэт на першую чвэрць бюджэтнага году. З паправак, запрапанаваных к праэкту бюджэту, камісія ўхваліла толькі запраўку дакладчыка Кржыжаноўскага (сакратар урадовага блёку) аб павялічэньні асыгнаваньня на ўтрыманьне дзяржаўных чыноўнікаў на 31 міліён злотых. Рэшта паправак адхілена».

Выбары прэзыдыумаў соймавымі клюбамі

„Вызваленьне" выбрала старшынёю свайго соймавага клюбу пасла Вазьвіцкага, Пяст—Вітаса, а з прычыны яго адмовы—пасла Сраднеўскага, Ундо-д-ра Д. Лявіцкага радыкал-сацыялісты—пасла Хруцкага.

Беларускія клюбы ў сойме

Беларусы, выбраныя ў сойм і сэнат, разьбіліся на тры клюбы. сельсаюзнікі і хадэкі складаюць адзін клюб, б. грамадаўцы—другі і група Я. Станкевіча—трэці.

УКРАІНСКІЯ КЛЮБЫ Ў СОЙМЕ.

У сойме арганізаваліся наступныя украінскія клюбы: «Клюб укр. сац.-радыкальнай парляментарнага прадстаўніцтва», клюб Сельроб-правіцы, клюб Сельроб-лявіцы, клюб «УНДО».

Мікрафоны ў сойме.

Дырэкцыя Варшаўскай радыё-станцыі ўстанавіла ў новым будынку сойму справаздачныя мікрафоны, дзякуючы якім можна будзе слухаць соймавыя прамовы.

Галадоўка арыштаваных ППС-лявіцы.

ВАРШАВА, 29-III. Зьняволеныя ў астрозе ў Краківе кіраўнікі лявіцы ППС на чале з Чумон, якія былі арыштаваны ў часе прадвыбарчае кампаніі, абвясьцілі галадоўку, патрабуючы вызваленьня з астрогу.

Арышты ў Луцку.

«Слово» (№ 71) паведамляе, што адміністрацыя зьліквідавала ў Луцку камуністычную арганізацыю, арыштаваўшы 22 асобы.

ПАСОЛ (А. СТАГАНОВІЧ ВЫПУШЧАН З АСТРОГУ.

25 сакавіка г. г. выпушчан з Навагрудзкага вастрогу беларускі пасол сойму, выбраны ў Навагрудчыне, гр. А. Стагановіч, які знаходзіўся ў вастрозе ад 1-3-1928 г. Водлуг слоў А. Стагановіча, у вастрог ён папаў дзякуючы фальшываму абвінавачаньню ўласным яго палітычным ворагам.

ЗАЧЫНЕНЬНЕ «ПРОСЬВІТЫ».

Водлуг загаду Дубенскага старасты зачынена павятовая украінская „Просьвіта" ў м. Дубні; таксама зачыненны ўсе філіі ў павеце. Павятовае памяшканьне «Просьвіты» апечатана. Прычынаю зачыненьня „Просьвіты" зьяўляецца тое, што яна быццам займалася палітычнай справай, а ня культурна-асьветнай.

КАМУНІСТЫЧНЫ СЬЦЯГ.

„Глос Правды" паведамляе, што аднаго вечара на электрычных дратох Залёна вул. (у Варшаве) быў вывешаны чырвоны штандар з антыдзяржаўнымі надпісамі. Паліцыя зьняла сьцяг і шукае вінаватых.

ПАСОЛ І СЭНАТАР У АСТРОЗЕ.

«Роботнік» паведамляе, што «насяроД выбраных у ўсеагульным галасаваньні прадстаўнікоў беларускага грамадзянства ў Польшчы два—сэнатар Рагуля і пасол Юккевіч застаюцца да апошняга часу ў астрозе».

НОВЫ КАРНЫ ЗАКОН.

У № 33 „Дзеньнік Уставаў Польскай Рэспублікі" агалошан загад прэзыдэнта рэспублікі аб новых карных законах з 1 ліпеня 1929 г.; з гэтага часу адміняюцца існуючыя дасюль тры карныя законы: расейскі, нямецкі і аўстрыяцкі.

ГЕН. ДОЎБАР-МУСЬНІЦКІ КАЕЦЦА.

Б. вораг марш. Пілсудзкага ген. Доўбар-Мусьніцкі зьмясьціў у «Двуграшоўцы» характэрны ліст, у якім публічна выказвае жаль з прычыны таго становішча і ролі, якія ён адыгрываў у часе маёвага перавароту.

Грэцыя ахоплена сялянскімі бунтамі.

АТЭНЫ, 27-III. СЯЛЯНСКІЯ НЕПАРАДКІ, ЯКІЯ РАСПАЧАЛІСЯ НА КРЫЦЕ Ў ЗЬВЯЗКУ З НЕПАСІЛЬНЫМІ ПАДАТКАМІ, ПЕРАКІНУЛІСЯ І Ў ІНШЫЯ МЯСЦОВАСЬЦІ ГРЭЦЫІ—У ФЭСАЛІЮ І ПЭЛЁПОНЭС; ГЭТЫЯ ПРАВІНЦЫІ ЛІЧЫЛІСЯ ДАСЮЛЬ АПОРАЙ КАНСЭРВАТЫЗМУ. У НЕКАТОРЫХ ВЁСКАХ ПЭЛЁПОНЭСУ АДБЫВАЛІСЯ МІТЫНГІ І ЎХВАЛЕНЫ ВОСТРЫЯ РЭЗАЛЮЦЫІ. НА КРЫЦЕ Ў ВЁСЦЫ УРЫСЫ БЫЎ СКЛІКАН МІТЫНГ. МЯСЦОВАЯ ЎЛАДА СПАЛІЛА ТЭЛЕГРАФНАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ.

У МЯСТЭЧКУ АГІЁС МІРОС УЛАДА АРЫШТАВАЛА СЕЛЯНІНА, ЯНОГА ЛІЧЫЦЬ КАМУНІСТАМ. СКЛАНЕ ЎЗЯЛІ ПАЛІЦЭЙСКІ ВУЧАСТАК ШТУРМАМ, ВЫЗВАЛІЎ АРЫШТАВАНАГА І ЗЬБІЛІ ЖАНДАРСКАГА ВАХМІСТРА.

Польска-літоўскія перамовы.

ПЕРАМОВЫ ПАЧНУЦЦА Ў КРАСАВІКУ

КОЎНЯ, 29-3. Водлуг вестак з пэўных крыніц, літоўска-нямецкія перамовы аб утварэньні гандлёвага ўгавору пачнуцца ў красавіку.

* * *

КОЎНЯ, 30-3. Вальдэмарас у гутарцы з спэцыяльным карэспандэнтам ТАСС аб літоўска-польскіх перагаворах паведаміў, што першай задачай перагавораў у Кёнігзбэргу будзе высьвятліць, якія прапанаваньні з польскага боку па пытаньнях, якія падлягаюць разгляду.

Адзначыўшы важнасьць пытаньня аб падтрыманьні палякамі дывэрсыйных банд Плячкайціса, Вальдэмарас заявіў: «Сёньня я атрымаў паведамленьне, што польскія ўлады патрабуюць выдачы трупаў двух забітых пры пераходзе праз дэмаркацыйную лінію плячкайцістаў. Гэта патрабаваньне кажа, што тут гутарка ідзе не аб салдатах рэгулярнай польскай арміі, а аб членах дывэрсыйных банд, якія арганізуюцца на Віленшчыне і дзейнасьць якіх скіравана супроць Літвы. З гэтае прычыны патрабаваньне польскіх улад мае для нас з гэтага пункту гледжаньня дужа важнае значэньне».

У далейшым Вальдэмарас заявіў, што пытаньне аб узнагародзе за страты, якія нанесены Літве захватам Вільні, уключана ў праграму перагавораў.

На пытаньне карэспандэнта аб адносінах вялікіх дзяржаў да польска-літоўскае спрэчкі Вальдэмарас адказаў: «На сэсіі Лігі Нацый у сьнежні, а таксама і ў іншых выпадках, дзяржавы выступалі па пытаньню аб польска-літоўскай спрэчцы толькі як члены Лігі Нацый, а ня як вялікія дзяржавы».

АД'ЕЗД ПОЛЬСКАЕ ДЭЛЕГАЦЫІ.

ВАРШАВА, 30-3. Выехала ў Кёнігзбэрг польская дэлегацыя для перамоў з літоўскай дэлегацыяй. На чале дэлегацыі міністр замежных спраў Залескі.

* * *

КЁНІГЗБЭРГ, 30-III. Сёньня прыехала польская дэлегацыя па перамовах з Літвой на чале з Залескім. Між польскай і літоўскай дэлегацыямі адбываецца тымчасовы абмен думкамі па праграме перамоў. Залескі адмовіўся прыняць прадстаўнікоў друку да ўстанаўленьня кантакту з Вальдэмарасам.

СКЛАД ЛІТОЎСКАЕ ДЭЛЕГАЦЫІ.

На польска-літоўскую канфэрэнцыю ў Кёнігзбэрзе выехалі з Коўні: прэм'ер Вольдэмарас, дырэктар дэпартаманту мін. зам. спраў Заўніус, літ. пасол у Нямеччыне Сідікаўскас, дыр. гандл. дэп. Паркайціс і інспэктар чыгунак інж. Сабаляўскас.

Крах „клясавае раўнавагі" ў Амэрыцы.

КАПІТАЛ РЭПРЭСІЯМІ СПРАБУЕ ЗАДУШЫЦЬ НАРАСТАНЬНЕ ПРАЛЕТАРСКАЕ БАРАЦЬБЫ.

НЬЮ-ЁРК, 29-3. Арганізаваны левым крылом прафсаюзу горнарабочых «камітэт ратаваньня саюзу» заклікаў неарганізаваных ім гарнякоў у Пэнсільваніі распачаць 16-га красавіка забастоўку.

У штаце Агайё арыштована больш 200 горнарабочых за тое, што яны бяруць удзел у забастоўцы, не зважаючы на судовы загад аб „устрыманьні ад спыненьня працы".

АРЫШТЫ ДЭМАНСТРАНТАЎ-БЕСПРАЦОЎНЫХ.

НЬЮ-ЁРК, 29-III. У ...ыкаго перад будынкам муніцыпалітэту адбылася дэманстрацыя беспрацоўных. Паліцыя разагнала дэманстрантаў і арыштавала 3-х з іх.

РАЗВАЛ ВЭДЫНСКАЕ АПАЗІЦЫІ.

БЭРЛІН, 24-3. Пасьля выключэньня Вэбера і Рызэ з кампартыі Нямеччыны ў радох Вэдынскае апазіцыі распачаўся развал. Некаторыя выдатныя дзеячы гэтае групоўкі паведамілі ЦК і бэрлінскі акруговы камітэт кампартыі Нямеччыны, што яны рашуча проці курсу, узятага Вэберам і Рызэ на супрацоўніцтва з арганізацыяй Маслава. Разам з тым гэтыя дзеячы вэдынскае апазіцыі прапануюць акруговаму камітэту ўстрымацца ад далейшых захадаў у адносінах да вэдынскіх апазіцыянэраў, большасьць якіх, водлуг іх слоў, зганьбіць курс Вэбера і Рызэ.

Нарэшце дзеячы вэдынскае апазіцыі заяўляюць, што яны не жадаюць мець нічога супольнага з Рут Фішэр.

ДЭМАНСТРАЦЫЯ СІЛ ПРАЛЕТАРЫЯТУ ПРАГІ.

ПРАГА, 29-3. Аб'яднаны сход пратэстаў проці ўрадавага праэкту закону аб сацыяльным страхаваньні, супольна назначаны на 29-га сакавіка абодвымі прафсаюзнымі аб'яднаньнямі, у апошнюю хвіліну быў заборонены паліцыяй.

Да моманту скліку сходу Прага набыла выгляд вайсковага лягеру. Па ўсім горадзе разьяжджала паліцэйская варта і жандары. Рабочыя кварталы і ваколіцы былі адрэзаны ад цэнтральных частак гораду; месца, дзе быў назначан сход, было абкружана буйнымі паліцэйскімі сіламі.

Аднак, калёна рабочых у 10 тысяч чалавек здолела прарвацца праз усе паліцэйскія перагародкі. Не зважаючы на ўсе перашкоды, сход усё-ж такі адбыўся. У розных частках гораду здарыліся стычкі з паліцыяй, у выніку якіх шмат рабочых паранена, у тым ліку 4—цяжка.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

Барацьбіты баварскае камуны ў СССР.

МСКВА, 29-III. У Маскву прыехалі з Бэрліну вызваленыя з нямецкіх астрогаў дзеячы Баварскае савецкае рэспублікі і некалькі нямецкіх камуністаў, якія адбывалі доўгую адсідку ў астрозе. Нямецкія рэвалюцыянэры прыехалі ў СССР, водлуг запросін ЦК МОПР і будуць накіраваны на паўднёвыя курорты СССР для палепшаньня стану здароўя, падарванага гадамі суровага астрожнага рэжыму.

Пад суд за прымусовае распаўсюджаньне пазык

ЛЕНІНГРАД, 27-3. У паштовых канторах Ленінградзкае вобласьці было некалькі выпадкаў прымусовага продажу агентамі нарсувязі аблігацый сялянскае пазыкі. Частка сумы па пераводах выдавалася аблігацыямі. Кіраўніцтва сувязі загадала не дазваляць падобных выпадкаў, а агентаў за прымусовы продаж аддаваць пад суд.

Каштоўныя мінэралы на Валыншчыне.

КІЕЎ, 29-3. Устаноўлена, што ля Жытоміра ёсьць залежы белага кварцу, патрэбнага для вырабу хрусталёвага шкла. Асаблівасьцю гэтага кварцу зьяўляецца тое, што ён плавіцца пры тэмпэратуры ў 1.300 градусаў, у той час, як усе іншыя пароды кварцу плавяцца пры мінімальнай тэмпэратуры ў 2.000 градусаў. Розьніца ў тэмпэратуры дасьць вялікую эканомію палу.

У аколіцах Ушаміру знойдзены залежы вялічэзнае каштоўнасьці тытаністага жалезьняка, з якога робіцца сталь для броняваньня драдноутаў і і панцырных паязоў.

НАЗНАЧЭНЬНІ ПА ЦСУ СССР.

МАСКВА, 28-3. Прэзыдыум ЦВК СССР пастанавіў назначыць намесьнікамі кіраўніка Цэнтральнаю Статыстычнаю Управаю СССР т. т. Шмідта, Пашкоўскага і Крыцмана і вызваліць Кержанцава ад абавязкаў намесьніка кіраўніка ЦСУ СССР.

РОСТ УКЛАДАЎ У КАСЫ АШЧАДНАСЬЦІ.

МАСКВА, 26-III. Люты адзначыўся рэкордным прытокам укладаў у касы ашчаднасьці і значным павялічэньнем ліку ўкладчыкаў. Лік укладчыкаў павялічыўся на 75 тысяч 527 у гарадох і на 63 тысячы 888 у паселішчах. Прыток укладаў у гарадох і паселішчах склаў 34.839.300 руб.

С.-Г. ПАДАТАК САБРАНЫ ЦАЛКАМ.

МАСКВА, 26-III. Ад пачатку сельска-гаспадарчае падатковае кампаніі да 1 сакавіка па СССР здадзены каля 312 міліёнаў руб. сельска-гаспадарчага падатку, што складае амаль 100 процантаў назначэньня. Такім чынам, кампанія бягучага году канчаецца да тэрміну (агульнасаюзны тэрмін — 1-га красавіка)

ЧАКАНКА ПЭРСІДЗКІХ ГРОШ... ЛЕНІНГРАДЗЕ.

ЛЕНІНГРАД, 28-3 Манэтны скончыў выпуск першае партыі сідзкае манэты на адзін міліён наў. Усяго будзе выбіта 3 міліёнаў.

ЗЕМЛЯЗДРЫГ У АЗЭРБ... ДЖАНЕ

БАКУ. 29 сакавіка ў Нусе... ваўся штуршок надзвычайнае ... цягнуўся 30-40 сэкунд. Усе ... пабудовы падарваны больш 50 проц., у іншых зрабіліся ... Ахвяр няма.

РАЙПРАЦАЎНІКІ—ЗЛАЧ... ЦЫ.

НОВАРАСЕЙСК, 19-III. Арыш... ны, выключаны з партыі і адда... пад суд ранейшы сакратар Сочынска... райкому партыі Заранаў, старшы... Сочынскага райвыканкому Занчэнка... шмат адказных працаўнікоў Сочынс... га райёну, якія ў працягу году ... нілі выключныя злачынствы: рас... ты дзяржаўных і грамадзкіх гро... гвалты над жанчынамі, займ... н'ствам і ...

Горкаўскія дні ў СССР

Перамогшы пралетарыят ад... свайго буравесь...

Пастанова СНК ССС...

МАСКВА, 29-III. У дзень 60-х угодак ад дню нараджэньня і 35-х угодак літаратурнае дзейнасьці Алексея Максімавіча Пяшкова (Максіма Горкага) Савет Народных Камісараў Саюзу ССР адзначаючы выключныя заслугі гэтага вялікага рэвалюцыянэра пісьменьніка, творчасьць якога непарыўна зьвязана з жыцьцём працоўных мас нашага краю і іх барацьбою проці дарэвалюцыйнае царскае і капіталістычнае Расеі.

Максім Горкі ўвайшоў у шэрагі барацьбітоў маотацкага слова ў 90-х гадох, калі гаспадаром у літаратуры была буржуазная інтэлігенцыя. Ён прышоў з гушчаў прыгнечаных працоўных візоў і прынёс з сабою пачуцьцё гнёўнага пратэсту проці прыгнечаньня і прыніжэньня ўсім грамадзкім укладам фэадальна-капіталістычнага ладу чалавечаскае асобы. Яскравымі вобразамі сваёй творчасьці падрыхтоўвае ён рабочую клясу ДА ПЕРШАГА ШТУРМУ цьвярдыняў царызму і капіталу, ДА НАШАЕ ПЕРШАЕ РЭВ... нікам якое ён б... кі як пісьменьнік, але ... дзеяч браў асабісты ўдзе... ным руху, ня раз аказваў ... могу рабочай клясе і каму... ... і ў сучасны момант ... рацьбы проці ворагаў пер... рабоча-сялянскае рэспублікі.

Савет Народных Камісараў пастанаўляе АДЗНАЧЫЦЬ ГЭ... ВЫЗНЫЯ ЗАСЛУГІ АЛЯКСЕ... ВІЧА ПЯШКОВА ПЕРАД РАБО... ПРАЛЕТАРСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ... САЮЗАМ САВЕЦКІХ САЦЫЯ... РЭСПУБЛІК.

Старшыня Савету Народных Саюзу ССР А. І.

КРЭМЛЬ.

29-га сакавіка 1928 г.

Адзначэньне юбілею ў Нямеччыне.

БЭРЛІН, 28 III. 60-я ўгодкі ад дню нараджэньня і 35-я ўгодкі літаратурнае дзейнасьці Максіма Горкага адзначаюцца ў Нямеччыне ўрачыстымі сходамі, спэктаклямі і літаратурнымі выступленьнямі. Усе больш ці менш значныя газэты Нямеччыны агалашаюць падрабязныя артыкулы жыцьцяпісанага характару, успаміны, адрыўкі з твораў Горкага і г. д. Амаль адназгодная ацэнка, што Горкі ня толькі вялікая славутасьць у сусьветнай літаратуры, але і вялікі чалавек і вялікі барацьбіт за волю.

Тэатр Піскатора супольна з таварыствам прыяцеляў новае Расеі і выдавецтвам М... лік наладзілі ўрачыстую ранiцу, прысвя... чаную Горкаму.

Вялікае месца займае Горкі і ў праграмах радыё-апавяшчэньня. Будзе прачытана шмат дакладаў аб Горкім і адрыўкі з яго твораў.

...носіны Нямеччыны да праблемы разброеньня.

Заява Штрэзэмана чужаземным карэспандэнтам.

...АЮЧЫ БАНКРОЦТВА ЛІГІ НАЦЫЙ У СПРАВЕ МІРУ, ШТРЭЗЭМАН „НЯ ТРА... ЦІЦЬ НАДЗЕЙ" НА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ РАЗБРОЕНЬНЯ.

...Н, 29-III. На банкеце чужа... прэсы выступіў з вялікаю пра... нямецкі міністр замежных спраў ...ан. Вылучыўшы з усіх пы... , зьвязаных з захаваньнем мі... касьці галоўнага—пытаньне аб ...ьні; Штрэзэман заявіў, што ён ...сваім абавязкам выказаць са... ...я адносіны нямецкага народу ...а пытаньня. Раней усяго Штрэ... ...тэгарычна адхіліў выказаны ў ...ным друку пункт гледжаньня, ...меччына ня імкнецца да ўсе... ...га разброеньня і сьвядома да... ...а правалу разброеньня, каб ат... , права вольнага ўзброеньня. ...якіх-небудзь кіруючых колах ...даю сапраўды верацъ у існа... ...ў Нямеччыне такіх пабочных ...дык існуе вельмі просты спо... ...ўйнаваць гэтыя намеры, а, улас... ...пачаць сапраўднае і сур'ёзнае ...ньне.

...эзэман робіць выняткі з заключ... ...ратэколу Лёкарнскіх угавораў ...га кастрычніка 1925 г., у якім ...ца, што Лёкарнскія ўгаворы ...даны для зьмягчэньня напру... ...маральных дачыненьняў між ... і з тае прычыны, што яны ...ць мі... бяспечнасьць Эўро... ...пы, дык тым самым яны зьяўляюцца найлепшым сродкам, каб паскорыць ажыцьцяўленьне разброеньня, прадугледжанага артыкулам 8 статуту Лігі Нацый, і што «ўрады-удзельнікі ва ўгазоры абавязваюцца з гэтага часу сапраўды спрыяць Лізе Нацый у яе працы аб разброеньні і імкнуцца ў агульнай згодзе да ажыцьцяўленьня разброеньня».

Штрэзэман сьцьвярджае, што **гэтыя ўрачыстыя словы зараз праз 2 з пал. гады ўсё яшчэ застаюцца пазбаўленымі ўсякага рэальнага зьместу.**

Штрэзэман падкрэсьлівае, што, не зважаючы на такое становішча, ён усё-ж такі адмаўляецца лічыць пытаньне аб разброеньні ў Лізе Нацый канчаткова пахаваным хоць-бы ўжо затым, што Ліга Нацый ня можа і не павінна адмовіцца ад вырашэньня гэтага пытаньня. Слова зараз за кіруючымі ў ваенных адносінах дзяржавамі. На іх ляжыць адказнасьць, на іх зьвернуты вочы і чаканьні ўсіх народаў. Я выказваю цьвёрдую надзею, што гэтыя чаканьні ня будуць ізноў ашуканы, і што ўжо на наступным сходзе рады Лігі мы будзем мець канкрэтныя эфэктныя пастановы. Калі я, не зважаючы на няўпэўненасьць і расчараваньне, усё-ж такі кажу аб надзеях і давер'і, дык мае вочы ў першую чаргу зьвернуты да вялікага магутнага народу **Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў.** Я вітаю думку аб агульным спакоі, вітаю зьвязаную з гэтым ініцыятыву згоды між эўрапейскімі дзяржавамі і народамі.

Чэмбэрлен цкуе савецкую дэлегацыю.

ЛЁНДАН, 29-3. Дыплёматычны асьведаміцель газэты «Дэйлі Тэлеграф», якая блізка стаіць да Чэмбэрлена, піша: «Паводзіны савецкае дэлегацыі ў Жэневе, як відаць, будуць мець глыбокія водгукі ў заходня-эўрапейскіх дзяржавах. Зьнявагі, якімі савецкая дэлегацыя пазакідала Лігу Нацый, зьяўляюцца заслужаным урокам для некаторых дзеячоў Лігі Нацый і ўсіх, хто дамагаўся, каб Масква запрашалася на кожную канфэрэнцыю, якую склікае Ліга Нацый».

За дзень.

Першая ластаўка.

Урадам імпэрыялістычных дзяржаў абавязкова неабходна хоць чым небудзь прыкрыць чарговы правал і бескарысьнасьць жэнеўскага разброеньня. Гэта тым больш неабходна, што, дзякуючы выступленьню тав. Літвінава на апошняй сэсіі папярэдняй камісіі, імпэрыялістычны фальш быў выкрыт больш чым калі небудзь. І пачын дэманстрацыі добрай волі да міру бярэ на сябе, зразумела, Вялікабрытанія.

Як відаць з друкуемых тэлеграм, ангельскі ўрад запрапанаваў стварыць новую «вашынгтонскую» канфэрэнцыю. Адказы, якія былі атрыманы з Японіі і Злучаных Штатаў Амэрыкі, гавораць аб тым, што новая Вашынгтонская канфэрэнцыя ўжо ацьцвіла, не пасьпеўшы расьцьвісьці. Ёй ня судзана нарадзіцца на сьвет, бо Японія «у прынцыпу» заўсёды і ўсюды за разброеньне, канкрэтна-ж ня хоча ісьці на канфэрэнцыю, якая можа прынесьці карысьць толькі Англіі.

Што-ж датычыцца Злучаных Штатаў, дык яны могуць сабе дазволіць нават не падкрэсьліваць свайго прынцыповага міралюбства. Адказ Англіі дадзен просты і ясны: ні аб якой канфэрэнцыі, якая магла-б паслабіць ваенна-марскую магутнасьць Злучаных Штатаў, мы слухаць ня хочам.

Яшчэ больш красамоўны адказ на бесспадзейную ангельскую спробу дэманстрацыі міралюбства Злучаных Штатаў далі на некалькі дзён раней. 22-га сакавіка бюджэтная камісія прадставіла пленуму палаты прадстаўнікоў новы ваенна-марскі бюджэт, які зьяўляецца рэкордным з часу Вашынгтонскай канфэрэнцыі 1922 г. **На флёт будзе выдана ў будучым годзе 359 млн. даляраў ці на 20 млн. больш, чым у мінулым годзе. У славу разброеньня будуюцца восем 10.000-тонных крэйсэраў, а на марскую пяхоту асыгнавана дадаткова міліён даляраў з мэтай павялічыць узброеныя сілы ў Нікарагуа і Кітаі.**

Польска-літоўскія перагаворы.

Учора ў Кёнігзбэргу пачаліся польска-літоўскія перагаворы. На перагаворы выехалі літоўскі прэм'ер Вальдэмарас і польскі міністр замежных спраў п. Залескі. Ужо таму можна думаць, што абедзьвюма сторонамі канфэрэнцыі прыдаецца вялікае значэньне і што зацяжны польска-літоўскі канфлікт шукае выхаду.

Аднак, калі лічыцца з тымі поглядамі гэтых зацікаўленых старон, якія былі не адзін раз выказаны імі ў польскай, літоўскай і нават замежнай прэсе, дык здаецца, што перагаворы наўрад ці дадуць пажаданыя вынікі.

Літва лічыць, што каб устанавіць з Польшчай нармальныя адносіны, трэба каб Польшча аддала Літве захопленыя тэрыторыі. Тут яскрава выступае з боку Літвы вусім праўнае вымаганьне дабі

Фашысцкі дэбют у польскім сойме.

На скрыжалях буржуазнага парлямантарызму зьявіўся новы сымбаль «Bій!», і заслуга па ажыцьцяўленьні гэтай рэформы належыць польскаму сойму. Зараз усім вядома, што ў сойме п. Пілсудзкага на кожнага прадстаўніка пралетарыяту і рэвалюцыйнага сялянства маецца цэлы ўзвод узброеных жандараў, якія па першаму закліку з міністарскіх лавак будуць зьбіваць нецакорлівых і зьдзекавацца над іх дэпутацкай недатычнасьцю.

Першы вопыт ужо зроблен. Ён сустаў з дэбютам толькі-што абранага сойму. І міна гэтага дэбютнага выступленьня нельга прайсьці без абурэньня.

Дэпутатаў-камуністаў зьбівалі кулакамі і прыкладамі вінтовак за тое, што яны спаткалі ўрад п. Пілсудзкага выгукамі: «Прэч тэрор!», «Вызваліце палітычных зьняволеных!». За гэтыя-ж крамольныя выгукі яны з наручнікамі былі кінуты ў загадзя нарыхтаваныя паецка-паліцэйскія фургоны і адвезены ў варшаўскую Бастылію.

Шмат яскравых старонак дала гісторыя буржуазнага парлямантарызму ў Эўропе. Хто ня памятае гэраізму аўстрыйскага рэйхсрату ў эпоху існаваньня Габсбургаў? Пралетарыят не забыўся аб выпадках уводу ўзброенай сілы у памяшканьне прускага ландтагу для гвалтоўнага выводу сацыялістычных дэпутатаў. Аднак, усё гэта нішто ў параўнаньні з тымі подзеямі, якія адыграліся 28 сакавіка ў варшаўскім сойме і адносна якіх нават польскі буржуазны друк прымушаны быў адзначыць, што яны зрабілі «моцнае» ўражаньне на прадстаўнікоў чужаземнага дыпляматычнага корпусу, якія прысутнічалі пры дзікім разгуле фашысцкай арэны.

Я, разумела, не спадзяёмся сёньня прымілівасьці з боку тэй самай народнай дыпляматы, якая два дні назад, і ненавіта на прапанове адной дэлегацыі ў Жэневе, выкінула зазначаюцы падрыхтоўчай камісіі аб адсоўненьню зазначэньне на тое, што сапецкі праект аднавядае ідэалам «палавецтва». Відаць наадварот, ненавіта гэта і натхніла ўрад п. Пілсудзкага на такі ўчынак у Варшаве. З гэтага пункту погляду мы перад сабой бясспрэчную «салідарнасьць» надворнапалітычных фашыстаў з унутрыпалітычнымі мамантамі, што фашысцкая дыктатура ўжо першым выступленьнем ў новым сойме належным чынам пакажа сьвярдую руку.

Дзіва-ж абэктыўныя прычыны штурму пераможнаў 4 сакавіка на гэты беспрыкладнага тэрору?

Здавалася-б, што, атрымаўшы значную большасьць галасоў, забясьпечыўшы сабе спачуваньнем міжнароднага капіталу і асабліва амэрыканскага, польская буржуазія спрабуе зрабіць «сацыяльнага замірэньня». Сам факт яшчэ некалькі дзён таму на парадзе ў клюбе так званага парляментарнага блёку абацаў, што будзе звяртаць увагай да Інстытуту... да, для нагляду прыз... ікоў ра... дзеі, аднак, таму, што ...шняй Польшчы дыктатар выбарчай ...ы, зразумела, ...адбівала сапраўдны сіл у краіне.

...адно самавольна-гвалтоўнае вядомага сьпісу ...блёку рабоча-сялянска... навочна паказала, што ...а стварыць парлямант... ра.

...а, з пункту погляду вы...барчай статыстыкі, фашысцкая дыктатура перамагла 4 сакавіка. Цэлыя пласты польскай буржуазеі з аграрыяў даверылі свой лёс і талент п. Пілсудзкаму ў імя той капіталістычнай стабілізацыі, якая пачалася ў Польшчы хутка пасьля майскага перавароту 1926 году. Аднак «сацыяльныя выяўленьні» гэтай стабілізацыі абавязковы для Польшчы, бадай, яшчэ ў большай меры, чым для іншых капіталістычных краін, тым больш што ў Польшчы далёка яшчэ ня зьнішчаны тыя эканамічныя фактары, якімі абумоўлівалася разруха 1926 г., прымусіўшая Пілсудзкага наладзіць майскі перавалот. У галіне эканамічнай нявырашанае пытаньне аб рынках збыту для польскай прамысловасьці яшчэ і цяпер робіць націск на эканоміку краіны ў выглядзе пасыўнага гандлёвага балянсу і перавытворчасьці, праблема аднаўленьня асноўнага капіталу прамысловасьці далёка ад вырашэньня; адсталай, у параўнаньні з суседняй нямецкай, прамысловасьці Польшчы прыходзіцца напружыць усе сілы для захаваньня канкурэнтаздольнасьці. Беспрацоўе за апошні квартал 1927 году і ў першыя два месяцы бягучага году значна павялічылася. Становішча рабочай клясы в кожным днём пагаршаецца, суровая рацыяналізацыя праводзіцца за кошт рабочых, зьніжэньне рэальнай заработнай платы на 25 проц. у параўнаньні з 1925 г.,—усё гэта спрыяла таму, каб зьнішчыць у асобных пластох рабочае клясы ілюзіі, зьвязаныя з імем Пілсудзкага.

Довадам служаць вынікі выбараў 4 сакавіка ў Варшаве, у Дамброўскім раёне і ў іншых прамысловых цэнтрах: верныя прыяцелі Пілсудзкага—пэпэсаўцы—пацярпелі тут лютае паражэньне.

Як і раней нявырашаным застаецца аграрнае і перабытанае з ім нацыянальнае пытаньне. Зямельны голад, пры цяжкай налогавай палітыцы ўраду, зьяўляецца паранейшаму фактарам, рэвалюцыянізуючым польскую вёску,—успомнім аб разгроме польскай «незалежнай сялянскай партыі» і Беларускай Грамады.

Зусім на трэба доказу, што гэтыя аб'ектыўныя абставіны ні троху ня зьменены фактам фармальнай урадавай перамогі на выбарах 4 сакавіка. Наадварот, з гэтага для дыктатуры п. Пілсудзкага і выплывае неабходнасьць трымаць курс выяўленьня «моцнай улады», на бязьлітасную барацьбу з рабоча-сялянскай крамолай. Справа толькі ў тым, што ў спэцыфічна-польскіх умовах гэта тэндэнцыя адразу прымае выгляд крывавага пагрому ў стылі ўчарайшых падзей у сойме, тады як у краіне «клясычнага парлямантарызму, на берагох Тэмзы, яна завецца «мірам у прамысловасьці».

Н. Менскі.

Вестні адусюль.

ЦІКАВАЕ ЗДАРЭНЬНЕ З АЭРАПЛЯНАМ.

20 сакавіка г. г. на самалёт паветранай лініі «Аэралёт» напаў у часе пералёту пад Татрамі (Карпаты) аграмады арол. Напад быў такі моцны, што самалёт захістаўся ў паветры. Пілёту ўдалося выраўнаць аварат. Арол згінуў на месцы.

КАТАСТРОФА ЛІТОЎСКАГА САМАЛЁТА.

22 сакавіка г.г. ў Марыямпалі ўпаў на зямлю і спаліўся літоўскі самалёт. Прычынай катастрофы быў моцны вецер. Лётчык капітан Яцушкевіч атрымаў цяжкія кантузіі.

ЛАВІНЫ.

Сьнежныя завеі ў Тыролі сталі прычынаю таго, што ў некалькіх мясцовасьцях абсунуліся сьнежныя лавіны. Адна такая лавіна абсунулася ў райёне Зальцбурга і засыпала 13 асоб, якія загінулі. Ахвярамі лавіны былі турысты з Вены.

Перад вясеньняй сяўбой.

АДОЗВА

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР да сялянства аб пашырэньні яравых засеваў увясну 1928 г.

Супольнай упартай працай рабочых і сялян Савецкай Беларусі мы дасягнулі таго, што к дзесятай гадавіне Кастрычніка зруйнованая імпэрыялістычнай і грамадзянскай войнамі народная гаспадарка краіны, і ў прыватнасьці наша сельская гаспадарка, адноўлена, дасягнуўшы і перайшоўшы даваенны ўзровень. Дасягнутыя посьпехі, аднак, вельмі яшчэ далёкі ад тае мэты, якую ставіць сабе савецкая дзяржава ў галіне падняцьця матар'яльнага ўзроўню і палепшаньня дабрабыту сялян, а нашая сельская гаспадарка дае яшчэ вельмі нізкі ўраджай.

У мэтах дапамогі сялянству, Савецкая Ўлада БССР у бягучым годзе ўскладае на разьвіцьцё сельскае гаспадаркі звыш 27.000.000 рублёў. Гэтыя дзяржаўныя асигнаваньні поўнасьцю пойдуць на забесьпячэньне сялянскіх, калектыўных і іншых гаспадарак сродкамі сельска-гаспадарчае вытворчасьці — насеньнем, угнаеньнем, сельска-гаспадарчымі машынамі і прыладамі, на правядзеньне земляўпарадкаваньня, мэліярацыі, на набыцьцё рабочай жывёлы, на разьвіцьцё жывёлаводзтва і на пабудову заводаў на пераапрацоўцы прадуктаў сельскай гаспадаркі.

Гэтае імкненьне Савецкай Улады дапамагчы сялянству хутчэй перабудаваць сельскую гаспадарку ў напрамку больш высокай яе прыбытковасьці з найбольшым посьпехам будзе вырашана толькі тады, калі кожны селянін і селянка Савецкай Беларусі з свайго боку будуць імкнуцца да палепшаньня сваёй гаспадаркі. Больш карысьці дае зямля ў тых гаспадарках, якія з дапамогай і пад кіраўніцтвай Савецкае Улады перайшлі да новых калектыўных форм землякарыстаньня, да ўжываньня палепшаных прыёмаў вядзеньня сельскай гаспадаркі праз увядзеньне шматпольнага севазвароту, палепшаных машын і прыладаў, сартавога насеньня, мінэральных угнаеньняў і г. д.

Пераход на больш высокі ўзровень вытворчасьці не па сілах асобнай сельскай гаспадарцы—часта не хапае сродкаў, няма навыку, а галоўнае ўжываньне палепшанага складанага інвэнтару ў асобнай сялянскай гаспадарцы не акупляецца. Адсюль вынік, што найбольш правільны і хуткі шлях да паляпшэньня сельскай гаспадаркі—гэта Ленінскі шлях—шлях аб'яднаньня бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак у таварыствы, арцелі, камуны і калектывы па агульнай апрацоўцы зямлі і каапэраваньне.

Савецкія і калектыўныя гаспадаркі і камуны, як стаўшыя ўжо на сацыялістычны шлях, сваім інвэнтаром, насеньнем і вопытам больш дасканалых форм землякарыстаньня павінны аказаць максымальную дапамогу акаляючаму бядняцкаму і серадняцкаму сялянству і служыць узорам культурнага і рацыянальнага вядзеньня сельскае гаспадаркі.

Надыходзіць пара веснавое сяўбы, самы адказны перыяд сельска-гаспадарчага году для сялянства.

У першую чаргу неабходна павялічыць яравы палетак шляхам увядзеньня ў гаспадарчае карыстаньне аблогаў, раскарчовак, мэліараваных плошчаў і скарачэньня незанятага папару. Павялічэньне яравога кліну карысна для сялянства, бо ня толькі забясьпечвае яго гаспадарчыя патрэбы, але дае магчымасьць прадаваць гораду больш прадукцыі і атрымаць ад яго больш тавару.

Побач з пашырэньнем яравога кліну стаіць яшчэ больш важная задача—павялічыць пасеў найбольш карысных для сельскай гаспадаркі тэхнічных культур (ільну і канапель), прапашных (бульбы і карняплодаў), травяных (канюшыны, серадэлі і вікі) і пасеваў лубіну на зялёнае ўгнаеньне. Пашыраючы пасеў траў, карняклубнявлодаў, тэхнічных культур і лубіну, сялянства ня толькі павялічвае прадукцыю молочнай гаспадаркі і таварнасьць сельскае гаспадаркі, але адначасова забясьпечвае фабрыкі і заводы неабходнай сыравінай. Калі ня будуць пашыраны пасевы ільну і канапель, фабрыкі і заводы ня будуць мець магчымасьці забясьпечыць насельніцтва мануфактурай. Пашырэньне пасеву траў і прапашных культур дапаможа разьвіцьцю прадукцыі малочнай гаспадаркі, дае магчымасьць вывезьці ва можы прадукцыі малочнай гаспадаркі і крахмал і прывезьці з-за межаў неабходнае для нашых фабрык і заводаў абсталяваньне і тым самым павялічыць вытворчасьць прамысловасьці.

Не забясьпечыўшы горад належнай колькасьцю прадуктаў, апошні ня можа павялічыць вытворчасьці сельска-гаспадарных машын і прыладаў і іншых тавараў, патрэбных для сялянства. Толькі пры супольных змаганьнях працоўных гораду і вёскі магчыма пасьпяховае разьвіцьцё народнай гаспадаркі і тым паляпшэньне жыцьця рабочых і сялян.

Пасьпяховае вырашэньне задач веснавой пасяўной кампаніі магчыма толькі пры выпорокім і магутным удзыме той самадзейнасьці самаго сялянства, якая апошнія гады адыгрывае ўсё растучую ролю ў адбудове і разьвіцьці сельскае гаспадаркі ў сацыялістычным напрамку.

Прэзыдыум ЦВК БССР зварочваецца да сельска-гаспадарчых рабочых і работніц, сялян і сялянак, членаў арцеляў, камун і калектываў і да каапэрацыйных аб'яднаньняў, з заклікам сьвядома і рашуча правесьці бягучую вясковую пасяўную кампанію пад знакам павялічэньня яравога кліну, пашырэньня засеву рыначных і тэхнічных культур і паступовага пераходу да калектывізацыі і шматпольля, што зьяўляецца—верным шляхам сацыялістычнага разьвіцьця нашае сельскае гаспадаркі.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

29 сакавіка 1928 г.
г. Менск.

Ці ўсё намі зроблена да сяўбы.

Аснаўнымі с.-гасп. машынамі сялянства будзе забясьпечана.

Водлуг вестак Наркамзему плян па загатоўцы аснаўных с.-гасподарчых машын будзе выкананы амаль што цалкам. Так, плугоў завезена ўжо 87 проц. заданьня, розных барон—61,5 проц., сартовак—87,4 проц., ільнатрэмчотак—62,7 проц., веялак—43 проц., сеялак—87,6 проц. заданьня і г. д. Горш справа з трыерамі, бо апошніх завезена вельмі мала, слаба справа і з трактарамі—завезена толькі 14,9 проц. заданьня.

Штучнага ўгнаеньня ня хопіць.

Згодна заключаных умоў штучнага ўгнаеньня поўнасьцю будзе завезена ў першых дзёх красавіка. Пакуль што завезена суперфасфату 84,4 проц. таго, што меркавалася, калійнай солі—55 проц., фасфарытнай мукі—31,6 проц. і азоцістага ўгнаеньня толькі 25 проц. вызначанага па пляну. Трэба адзначыць, што сялянства зразумела ставіцца штучнага ўгнаеньня ў справе падняцьця сваёй гаспадаркі і таму мы назіраем вялікі попыт на апошняе.

Такім чынам, задаволіць запатрабаваньні сялянства штучным угнаеньнем поўнасьцю ня ўдасца і ў ім будзе адчувацца значны недахват. Неабходна будзе павесьці працу на мясцох, каб недахват штучнага ўгнаеньня быў запоўнены торфам, попелам і інш.

Трэба ўзмацніць загатоўку лубіну.

Па апошніх вестках плян па завозу насеньня канюшыны выкананы на 109 проц., вікі—92,9 проц., цімафеўкі—54,2 проц., сэрадэлі—69,4 пр., корняплодаў—80 проц., лёну-даўгунцу—61,6 проц., лугавых траў—30 проц. і лубіну загатоўлена толькі 7,2 проц. пляну. Спадзяваецца на завоз лубіну з іншых месц Саюзу ня прыходзіцца, а таму трэба прыняць усе меры да загатоўкі яго на мясцох. Між тым, нізкая сетка с.-гасп. каапэрацыі вельмі мала цікавіцца гэтай справай, а як мы ўжо бачылі, штучнага ўгнаеньня ня хопіць і лубін павінен замяніць апошняе. Лубін жа ў сялянства ёсьць, яно зараз пачынае малаціць і ўвесь лішак павінен быць закуплены,—толькі пры гэтых умовах становішча можа быць палепшана.

Плян па загатоўцы аўса павінен быць выканан поўнасьцю.

Загатоўка ярыны—аўса і ячменю ў межах БССР праходзіць вельмі слаба; так, аўсу загатоўлена толькі 68,7 проц. заданьня і ячменю—76,7 проц. Водлуг вестак Нар. Ком. Гандлю СССР адгрузка аўса для Беларусі поўнасьцю будзе скончана. Усяго да вясеньняй пасяўнай кампаніі ў БССР будзе завезена з іншых райёнаў Саюзу 400.000 пуд. аўса, які быў ужо ўлічаны плянам. Між тым з усіх округ наступаюць заявы аб дадатковым завозе аўса, але больш 400.000 пуд. БССР не атрымае,—вось чаму трэба нашым загатавіцелям скарыстаць застаўшыся час і плян па загатоўцы насеньня аўса і ячменю выканаць на ўсе 100 проц.

Ачыстка насеньня праходзіць слаба.

Плянам было вызначана па ўсёй БССР ачысьціць мінімальна 2.070.000 пуд., па вестках жа ад 6 округ да 20 сакавіка ачышчана ўсяго 402.000 пуд.,—гэта значыць толькі 24,5 проц. плянавага заданьня. Цікава адзначыць, што Меншчына нават ня ведае, колькі ачышчана насеньня па акрузе, Бабруйшчына ачысьціла толькі 10 проц. заданьня, Аршаншчына—9,4 проц., Віцебшчына—14 проц., Гомельшчына—32,5 проц., Полаччына—40 проц. і Магілеўшчына 60 проц. свайго пляну, а з Мазырчыны ўсё яшчэ няма вестак, відаць там, як і ў Меншчыне, ня ведаюць, што ў іх робіцца. Там, дзе прыняты належныя меры, ачыстка насеньня праходзіць з посьпехам, а дзе спакойна сьпяць, дык і вынікі кепскія. Адстаючым округам трэба прыняць самыя рашучыя меры, каб праца па зернаачыстцы разгарнулася належным чынам, бо дырэктывы ўраду павінны быць выкананы поўнасьцю. Калі-ж гэтыя меры ня будуць прыняты, дык ужо зараз можна сказаць, што падрыхтоўка да пасяўнай кампаніі будзе правалена.

Наркамфін ня выконвае дырэктыў.

Для крэдытаваньня сялянства да пасяўнай кампаніі Белсельбанк накіраваў на месцы 2860000 руб. Апрача таго, калгасам пераведзена па округах 870.000 руб. і савхозам 1.225.000 р.

Побач з гэтым па каштарысных выдатках адпушчана з фонду беднаты 235.000 руб., або 50 проц. гадавога пляну, калгасам 149.000 руб.—36,3 проц., па насенаводзтва—200.000 р., ці 86 проц., савхозам—296.400 р.—59,2 проц. і ў аснаўныя капіталы 755.000 руб., ці 55,1 проц. гадавога пляну. З гэтых лічбаў відаць, што Наркамфін ня выканаў дырэктыў па фонду беднаты, крэдытаваньню калгасаў і савхозаў.

Пляны павінны быць пагоджаны з сялянскай гаспадаркай.

Мы ведаем, што як у округах, так і па райёнах ёсьць складзеныя пляны пасяўнай кампаніі, а ў сельсаветах гэтыя пляны адсутнічаюць і самае горшае, што пляны не даведзены да сялянина.

Зразумела, што плян бяз увязкі яго з сялянскай гаспадаркай,—гэта ўсяго толькі бюракратычныя мары і такіх «плянаў» па райёнах, здаецца, хапае. Гэтыя недарэчнасьці павінны быць зьнішчаны, усе мерапрыёмствы павінны быць распрацованы так, каб точна было вызначана: колькі кожная вёска ачышчае насеньня; якая пераходзе на цматпольле; колькі і дзе будзе чаго засеяна; наколькі пашыраецца пасеўная плошча і г. д. Толькі пры гэтых умовах можна будзе спадзявацца на пасьпяховае правядзеньне пасяўнай кампаніі.

Мясцовыя працаўнікі павінны праверыць, ці ўсё імі зроблена, каб вясеньняя пасяўная кампанія прайшла в тым посьпехам, якога чакае партыя і ўлада.

Насеньне будзе завезена.

Беларускае прадстаўніцтва ў Маскве паведаміла Наркамзем аб тым, што гэтымі днямі ў Хлебафуражнай Управе Наркамгандлю СССР абмяркоўвалася пытаньне аб сваячасовым завозе загатавіцелямі БССР патрэбнага насеньня. На нарадзе выявілася, што Хлебапрадукт да 24-га сакавіка поўнасьцю адгрузіў усё насеньне, Хлебацэнтр з 157 вагонаў адгрузіў 124, рэшта 33 вагоны ён абавязаўся завезьці да 1-га красавіка.

Цэнтрасаюз з 167 тысяч пуд. збожжа, якія па пляну павінны быць завезены, адгрузіў да 20-га сакавіка толькі 33 тысячы пуд., рэшта 134 тысячы пуд. загатавіцель абавязуецца адгрузіць да БССР 5-га красавіка

Наркамгандаль СССР запрапанаваў Хлебацэнтру і Цэнтрасаюзу закончыць адгрузку насеньня для БССР не пазьней 5-га красавіка.

Ёсьць думка, што насеньне будзе завезена сваячасова.

Кампанія ў разгары.

У нашым райёне працуе 4 зернаачыстных абозы, якімі дагэтуль ачышчана 11.625 пуд. насеньня. Асабліва пасьпешна ідзе праца па ачыстцы насеньня ва Ўраравіцкім і Целяшоўскім падрайёнах,—у некаторых насельніцкіх пунктах гэтых падрайёнаў абоз працуе дзень і ночь.

З боку сялянства ёсьць вялікі попыт на гатунковае насеньне: так, на авёс «Залаты дождж» паступіла заявак на 6000 пуд., на віку—на 800 пуд., канюшыны—200 пуд., на лён—800 пуд. Заяўкі на гатунковае насеньне ўсё яшчэ паступаюць. Апошняе сьведчыць аб тым, што вызначанае пляном гатунковае насеньне будзе разьмяркавана поўнасьцю.

Цяпер сялянства і штучным угнаеньнем, на якое паступіла заявак на 2000 пуд. Акрэа павінен паклапаціцца аб сваячасовай даставцы ўгнаеньня ў райён. Трэба сказаць, што ў бягучую кампанію сяляне выяўляюць вялікую зацікаўленасьць да каапэраваньня,—так, за час кампаніі арганізавана 4 пасёлкавыя таварыствы, 4—малочныя, 1—садовае і 2—машынных.

У бягучую кампанію па райёну будзе працаваць 15 злучных пунктаў з жарабкамі і валамі. Будуць таксама працаваць 2 злучаныя пункты з вытворцамі-кнырамі ў Пыцькаве і ў арцелі «Дружба».

Ніна. З.

Уваравіцкі райён, Гомельшчына.

„Ідэалёгія“ п. Умястоўскага.

(Быўшага беларускага дзеяча, а цяпер—пілсудчыка).

...лей, тым усё больш віленскі «Беларускі Дзень» Ф. Умястоўскага выходзіць на становішча трафарэтнага санацыйна-польскага органу друку. Праўда, друкуецца ён яшчэ на беларускай мове, нават «кірыліцай», але зьмест яго палітычных артыкулаў, як і іх прасякае, сьведчаць аб ...ім найноўшых і зусім бяскрытычных адносінах „Б.Д.“ да сучаснай афіцыяльнай Польшчы.

Здарыліся імяніны Пілсудзкага... і „БД“ палічыў патрэбным напісаць такія патэтычныя словы: «... Польшча сьвяткуе дзень імянінаў маршалка Пілсудзкага, найвялікшага патрыёта і будаўнічага незалежнай Польшчы».

Заўважце—«будаўнічага незалежнай Польшчы».

А што далей?

«Рэдакцыя «Б.Д.» прылучаецца да гэтага шырокага выяўленьня голду і шаны Вялікаму Сыну Беларуска-Літоўскіх земляў»...

Аказваецца, што «будаўнічы незалежнай Польшчы» зьяўляецца—па перакананьні п. Умястоўскага—«Вялікім Сынам Беларуска-Літоўскіх Зямель»...

Звычайна, як аб гэтым гаворыць тысячы прыкладаў з гісторыі паасобных народаў, такіх людзей, якія свой родны край аддаюць у няволю чужой дзяржаве, называюць не „Вялікімі Сынамі“ роднага краю, а проста—здраднікамі.

А тут аказваецца наадварот—вялікі сын, што захапіў часткі Літвы, Украіны і Беларусі і... далучыў іх да незалежнай Польшчы...

Такі пагляд на дзеі Пілсудзкага зусім зразумелы ў імпэрыялістычна настроенага галіка, а не ў беларускага дзеяча. Што за беларускі дзеяч, які захапляецца імянінамі «вялікага сына» захопленых ім беларускіх тэрыторый? Але—п. Умястоўскі, жадаючы быць «без лести преданным» ураду Пілсудзкага, сам не заўважвае, што ...іць «без лести преданный», калісь аб адным прыгаварыце.

...шляхі беларускага руху ў Польшчы. Ён пераконаны, што беларуская справа ня вырашана да апошняй пары ў Польшчы толькі таму, што ёю кіравалі праз увесь час эндэкі, а не маршалак Пілсудзкі, які, быццам, спачувае беларускай справе.

„Толькі дзякуючы працы гэных панаў (эндэкаў. Рэд.)—піша Умястоўскі—дасюць нацыянальныя дамаганьні беларускага народу пэ толькі не знайшлі справядлівай разьвязкі, але наогул ніколі ня былі пастаўлены на парадак дня; дзякуючы працы гэтых панаў, каторыя не хацелі прызнаваць у Польшчы нават існаваньня беларусаў, стварыліся паміж гэтымі двума народамі тыя ненармальныя адносіны, якія былі аднэй з прычын узросту і разьвіцьця Грамады; толькі дзякуючы ім не знайшла належнай разьвязкі справа беларускай школы; толькі дзякуючы ім імя «беларус» у вушох часткі польскага грамадзянства зычэла, як імя ворага польскага народу».

Як бачым, п. Умястоўскі ўзваліваецца ўсю віну за невырашэньне беларускіх спраў у Польшчы на эндэкаў. Згаджаемся з п. Умястоўскім, што эндэкі—ворагі беларускага народу. Але-ж не заўсёды эндэкі кіравалі Польшчай. Напрыклад, да лістапада 1922 году Польшчай кіраваў Пілсудзкі, як начальнік дзяржавы. Прайшло 3 з паловай гады, і зноў Польшчай ужо амаль ні два гады кіруюць ня эндэкі. А што мы бачым? Апрача абяцанак палепшаньня ўмоў беларускага жыцьця—заходняя беларусы ад нязэндэцкіх урадаў да апошняй пары нічога ня маюць, г. ё. яны маюць тое, што і пры эндэках—арышты, астрогі, катаваньні і наогул рэпрэсіі, але толькі больш сыстэматызаваныя і ў большай прапорцыі.

Якімі фактамі ў доказ сваіх цьвярджэньняў п. Умястоўскі можа пахвастацца? Фактаў гэтых няма. Усё ідзе па-старому, з тою толькі розьніцаю, што разам з заспакойваючымі абяцанкамі адбываецца разгром і ліквідацыя пры помачы рэпрэсій беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху. Ліквідаваць беларускі рух—ня толькі рэвалюцыйны, а і зусім можна сказаць лаяльны—вось задача п. Умястоўскага. Абгаворваючы вынікі выбараў у сойм і сэнат, пан Умястоўскі вельмі радуецца, што ад Зах. Беларусі, дзе палякаў найбольш процантаў 15, прайшло ў сойм і сэнат шмат палякоў-прыхільнікаў Пілсудзкага. Значыцца, п. Умястоўскі здаволен з таго, што ўсялякімі спосабамі беларускі голас быў прыдушан і перамаглі розныя абшарнікі і панскія надхалімы.

«Праўда,—кажа ён,—частка беларускага грамадзянства яшчэ сёньня аддала свае галасы за Блёк Нацыянальных меншасьцяў і за Грамаду. Аддала дзеля таго, што не расьсялася яшчэ атрутае паветра, створанае эндэцкай, паветра, у каторым толькі і маглі расьці і размнажацца гэныя два гатункі паганага зельля.

Цяпер, пасьля разгрому польскай чорнай сотні, з існаваньня каторай чэрпалі сокі для свайго жыцьця і ўзросту гэныя шкодныя расьліны, дні іх росквітну зьлічаны».

Вы чуеце, што піша п. Умястоўскі аб беларускіх палітычных групах не яго кірунку? Блёк прыгнечаных панскай Польшчай нацыянальных меншасьцяў і сапраўднага прадстаўніка беларускіх сялян і работнікаў «Грамады» ён называе «гатункамі паганага зельля», «шкоднымі расьлінамі», «дні росквіту якіх зьлічаны».

Такім чынам, выходзіць, што пан Умястоўскі лічыць зусім і вельмі пажаданым, каб прадстаўніцтва інтарэсаў заходніх беларусаў было аддана ў рукі толькі польскіх панаў і іх паслухмяных агэнтаў тыпу Умястоўскага. Беларускае прадстаўніцтва іншага характару—гэта «паганае зельле» і «шкодная расьліна».

Ці даўно п. Умястоўскі стаў так думаць аб розных беларускіх палітычных кірунках?

За польскія злотыя працуе пан Умястоўскі, як здраднік свайго народу, на карысьць сваю і панаў. Успамінаюцца трапныя словы байкі: „чым ты быў і чым стаў“...

Замежны.

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Дапамога беспрацоўным.

Гомель, 28-3. Працоўныя калектывы зьяўляюцца адной з лепшых формаў аказаньня працоўнае дапамогі беспрацоўным. На сёньнешні дзень у Гомельшчыне маецца 19 калектываў, з іх вытворчых 9, гандлёвых—2, працоўных—8. У працоўных калектывах занята 1659 чал., з іх жанчын—689 ч. Такім чынам у працоўных калектывах маецца магчымасьць выкарыстаць жаночую працу. Дырэктывы саюзных арганізацый аб ужываньні захадаў да павялічэньня ліку занятых у працоўных калектывах—выконваюцца. У сучасны момант маецца павялічэньне, згодна намечанага пляну на 269 і памячаецца павялічыць яшчэ на 181 чал.

Наогул, у бягучым годзе намечана прапусьціць праз працоўныя калектывы да 1500 чал. Арганізацыя працакалектываў сябе цалком апраўдала. Тормазам да разьвіцьця працакалектываў зьяўляецца адсутнасьць памяшканьня.

Апрача працапамогі, беспрацоўным штодзень выдаецца 300 дармовых абедаў і 200 па танных цэнах.

Наогул, на харчаваньне выдаецца штогод да 35.000 руб.

КЕПСКАЯ ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ ФАБРЫКІ «ДВИНА»

Віцебск, 29-III. Рабочыя Віцебскай фабрыкі «Двина» атрымалі ад рабочых фабрыкі «Идея», Уладзімірскай губ. ліст, у якім апошнія жаляцца на кепскую якасьць выпушчаемай «Двиной» прадзева. У прадзеве фабрыкі «Двина» было недамоту ад 90 да 110 нітакмотак. Кепская якасьць прадзева выклікала паніжэньне вырабу, недавыпрацоўку ткачамі нормы і павялічэньне браку.

ПЕРАСЯЛЕНЬНІ.

Ворша, 30-3. У гэтым годзе на 18539 душ перасяленцаў Аршанскай акругі, якія падалі заявы на перасяленьне, адведзена 3000 доляў калёнізацыйнага перасяленцкага фонду. Зямля калёнізацыйнага фонду разьмяркована ў наступных вабласьцёх Савецкага Саюзу: у Сібіры маецца 2000 доляў, ва Ўральскай вобласьці—500 доляў і на Далёкім Усходзе—500 доляў. З гэтых 3000 доляў ужо разьмяркована 2740 доляў акруговым зямельным аддзелам і 280 доляў пакуль што кінута для перасяленьня больш бедных сялян і беспрацоўных, якія знаходзяцца на Біржы Працы і жадаюць займацца сельскай гаспадаркай.

РАМОНТ ЗДАРОЎЯ РАБОЧЫХ.

Гомель, 30-3. У працягу летняга перыяду ў Гомелі і акрузе больш як 3600 рабочых палепшаць стан свайго здароўя. 2 красавіка распачнецца праца адборачнай камісіі. Чэнкаўскі дом адпачынку адчыніцца 15 мая. Праз дом адпачынку намечана прапусьціць 2400 чалавек. У гэтым годзе будзе зьвернута асаблівая ўвага на арганізацыю розных культурных забаў.

САБРАЛІ 50 ПРОЦ. ПРАТЭРМІНАВАНЫХ ПАЗЫК.

Віцебск, 28-3. Па апошніх данных сельска-гаспадарчая крэдытная каапэрацыя за ўвесь час кампаніі сабрала пратэрмінаваных пазык 138.000 руб.,—гэта значыць прыблізна да 50 пр. усёй запазычанасьці.

АДНАЎЛЕНЬНЕ ЛЕСАПІЛЬНЫХ ЗАВОДАЎ.

Ворша, 30-3. У сувязі з закупкай значнай колькасьці лесаматар'ялу Камтрэстам пушчаны ў ход Зуброўскі і Цёмналескі лесапільныя заводы.

У гэтым годзе на заводах будзе выпрацавана 4000 кубаметраў каштоўнага будаўнічага лесаматар'ялу.

НА «ДНЯПРОЎСКАЙ МАНУФАКТУРЫ».

Ворша, 30-3. У канцы 1928 году на фабрыцы «Дняпроўская Мануфактура» будуць устаноўлены 3 зьмены рабочых. Фабрыка цалкам будзе пераведзена на 7-мігадзінны рабочы дзень.

У сучасны момант на фабрыцы ўведзена значнае паляпшэньне ў працы рабочых. Да галоўнага корпусу фабрыкі дабудаваны цагельны будынак, у які перанесены заварачнае і шліхтавальнае аддзяленьні, чым зьменшана шкодная дзейнасьць пару заварачнага аддзяленьня, якое раней знаходзілася ў агульным памяшканьні. Гэтым умовы працы рабочых значна палепшаны.

АСУШВАЕМ БАЛОТЫ.

Пухавічы, 28-3. Сёлета будзе скончана праца па рэгуляваньню р. Талькі і пракопка магістраляй Сушінскага каналу працягам у 16 кілёмэтраў. На гэтыя работы асигнавана па дзяржаўнаму бюджэту 25.000 руб.

СЭКРАТАР „АПРАВЯРГАЮЦЬ“.

(ДА ПЫТАНЬНЯ ЗАБАРОНЫ ПРАДАЖЫ МУКІ БЕДНАЦЕ Ў ЧАРЭЙСКІМ РАЙЁНЕ).

9 сакавіка мы пісалі аб скажэньні чарэйскімі працаўнікамі дырэктыў партыі і ўлады ў галіне забясьпечаньня сялянскай беднаты мукой. Проста райвыканком забараніў спажывецкай каапэрацыі прадаваць муку ня толькі беднаце, якая не зьяўляецца пайшчыкам, але і той частцы, што каапэравана.

У сваім артыкуле мы ставілі запытаньне райвыканкому і райкому партыі,—як гэта яны дайшлі «до жизни такой».

Сёньня маем ужо 31 сакавіка, але райвыканком не знайшоў яшчэ часу даць сваё тлумачэньне. Райком партыі, дык той крыху больш акуратны і адказ яго,—выбачайце, «абвяржэньне», ляжыць перад намі, але лепш зьвернемся да апошняга.

„Пытаньне аб забараненьні прадажы мукі беднаце, як у Райкоме партыі, так і ў Райвыканкоме ніразу не стаяла, такім чынам гэткія дырэктывы мясцовай каапэрацыі не давались“.

Між іншым, сэкратар райкому спасылаецца на інструктара Белкаапсаюзу т. Шырокава, «які хоць беззпартыйны, але заўсёды па прыбыцьцю ў раён на прынцыпавым пытаньням, як з пачатку сваёй работы, так і вынікаў правядзеньня ім работы ставіў да ведама райком партыі, а аб гэтым выпадку ніразу ня было ім заяўлена»...

Паспрабуем таксама спаслацца не на заяву, а на дакладную запіску таго-ж самага т. Шырокава. Вось што ён піша:

«Па прыезьдзе ў Чарэйскі райён, я даведаўся ад старшыні праўленьня каапэратыву, што РВК даў вусны загад аб продажы мястачковаму насельніцтву выключна пячонага хлеба і аб поўным спыненьні продажы каапэратывам жытняй мукі. Спыненьне водпуску мукі ня толькі серадняком, ня маючым уласнага хлеба, але і беднякам прымусіла іх зьвярнуцца да прыватнага гандляра і пераплачваць па 20-30 кап. на пудзе. Гэтае становішча пагаршалася яшчэ тым, што масавае хлебапячэньне каапэратывам не праводзілася, а вынікалася ня больш 5 пуд. у суткі».

„Мэтад водпуску мукі ў Абчугскім спажывецкім таварыстве такі самы, як і ў Чарэі“,

піша ўжо інструктар Белкаапсаюзу

Дык як-жа, таварышы з Чарэі,—значыцца ўсё ў вашым райёне было добра. Між тым вы пішаце, што райком партыі даў дырэктывы яшчэ

РЭАЛІЗАЦЫЯ ПАЗЫКІ.

Заданьне па пазыцы неабходна выканаць поўнасьцю.

(Гутарка з нам. Наркамфіну БССР т. Кардашэнкам).

У БССР рэалізавана пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі на 1.345.313 руб., што складае 42 проц. заданьня. Больш-менш здавальняюча рэалізацыя праходзіць у Полацкай, Бабруйскай і Мазырскай акругах—і зусім кепска ў Аршанчыне, дзе заданьне выканана толькі на 25 проц.

Згодна інфармацыйных даных, якія ёсьць у Наркамфіне, можна з упэўнасьцю сказаць, што бяднацкія слаі насельніцтва адносяцца да пазыкі вельмі добра і ня толькі на словах, а і на справе. Лёзунг—«ніводнай сялянскай гаспадаркі без аблігацыі сялянскай пазыкі» гэтай групай насельніцтва ажыцьцёўлен.

Цікава адзначыць, што заможнае сялянства рознымі спосабамі стараецца ўхіліцца ад куплі аблігацый пазыкі.

У сувязі з набліжэньнем канчатковага тэрміну рэалізацыі пазыкі, на мясцох неабходна ўжыць усе сілы да ўзмацненьня агітацыі сярод тых, што яшчэ не набылі пазыкі.

Аб працы нашых контрагентаў можна меркаваць па наступных даных: у Бабруйскае пазыкі распаўсюджана на 314000 руб. з якіх саветы рэалізавалі на—55000 руб., лесазагатоўчыя арганізацыі—на 62000 руб., кааперацыя—на 35000 руб., селькомы—на 1400 руб., вайсковыя часьці—на 78000 р. і інш. на 82000 руб. Адгэтуль мы бачым, што вельмі слабы ўдзел у рэалізацыі пазыкі прынялі нашы сельскія камітэты ўзаемадапамогі.

Наогул, зварачае на сябе ўвагу тое, што па ўсіх акругах камітэты ўзаемадапамогі прынялі вельмі слабы ўдзел у рэалізацыі пазыкі. Так, па 6 акругах імі распаўсюджана аблігацый пазыкі ўсяго толькі на 3200 руб.

ВУЧНІ—ПРАПАГАДЫСТЫ ПАЗЫКІ.

(М-ка Самахвалавічы, Мен. акр.).

Настаўніцтва і мясцовыя працаўнікі непасрэдна прызавалі распаўсюджваньне пазыкі як сярод вучняў, так і сярод іншых бацькоў.

Для вучняў II канцэнтру Самахвалаўскае 7-кі зрабіў адпаведны даклад старшыня РВК, а з вучнямі I канцэнтру гутарку праводзілі настаўнікі групаводы. Эфэкт атрымаўся прыскны. Вучні адразу-ж адпагалосна ўхвалілі набыць калектыўна аблігацыі пазыкі па кожную клясу, і цяпер у нас няма ніводнае клясы без аблігацый. Усяго вучні сямігодкі набылі калектыўна аблігацый пазыкі на 62 р. 50 кап. і індывідуальна на 5 рублёў.

Самі дзеці не абмежаваліся сабранымі капейкамі: яны вядуць агітацыю за набыцьцё аблігацый і іх бацькамі.

З якой радасьцю апавядаюць яны адзін другому: «Мой тата таксама купіў аблігацыю», і наадварот, сьлёзы мімаволі паказваюцца на вачох у тых, бацькі якіх не згажаюцца або ня могуць набыць пазыку.

Настаўніцкі калектыў са свайго боку набыў аблігацый на 192 руб. 50 кап. А.

Першыя вынікі кампаніі па самаабкладаньні.

Водлуг вестак Наркамфіну БССР, насельніцтва Бабруйчыны правяло самаабкладаньне на суму 197.400 руб., Менчыны—на 106.766 руб., Мазырчыны—на 244.690 руб., Аршанчыны—на 215.861 руб. і Полаччыны—на 80.185 руб. З Віцебчыны, Гомельчыны і Магілеўчыны, незважаючы на зваг папярэджаньняў, нівяк вестак аб ходзе кампаніі па самаабкладаньні ў Нар. Ком. Фінансаў дагэтуль яшчэ не паступіла.

У адносінах налічэньня самаабкладаньня можна адзначыць, што Мазырская акруга займае першае месца ў БССР—самаабкладаньне ў Мазырчыне праведзена амаль што на ўсіх мясцовасьцях.

[illegible] мы паглядзім на тое, як ідзе на[illegible]не гроднай па самаабкла[illegible] прыняцця сказаць, што [illegible]тых справа ста[illegible], па Бабруйчыне [illegible]00 руб., па [illegible] Мазырчыне—[illegible]ычыне—13.000 р. [illegible]18 руб. Што зроблене [illegible] у Гомельчыне, Ві[illegible]ведаем, але відаць [illegible]валіцца, бо інакш [illegible]каны свячасова [illegible]мпаніі на самаабкла[illegible]аб тым, што на мяс[illegible]астаткова ўдзяляецца [illegible]амаабкладаньня. Магчыма зроблена куды [illegible]ваць весткі, але, дзя[illegible]ці вучоту і чоткасьці [illegible]вынікі не даюць нам [illegible]коіцца, а выклікаюць [illegible]сьпешнае правядзень[illegible]

[illegible] гэтак і з інфармацыі [illegible]якія выяжджалі на мес[illegible]а вядома, што заможная [illegible]ства ўсюды імкнулася і [illegible]ваць кампанію па сама[illegible]

[illegible]вісьні факт зрыву сходу [illegible]ункту гэтага райёну. [illegible]аўка праводзіўся аб'ядна[illegible]ны сход сялян хут. Пературкі, насёлку Ільлінкі і в. Нежаўкі. У парадку дню стаяла пытаньне аб самаабкладаньні на рамонт і абсталяваньне школы.

— Навошта нам самаабкладаньне, калі трэба будзе, дык і самі сабярём, шумела кучка гарлапанаў.

І гэтыя гарлапаны змаглі схіліць на свой бок і іншых сялян, не дапамаглі ў правядзеньні самаабкладаньня і быўшыя на сходзе працаўнікі райёну. Цікава адзначыць, сяляне не даверылі пісаць пратакол прэзыдыуму сходу, а даручылі гэтае мясцовай настаўніцы.

— Мы, кажуць, наперад пратакол праверым, зьнімем з яго копію, а тады дашлём у райён.

Усе гэтыя факты досыць яскрава сьведчаць аб тым, што на мясцох слаба праводзілася, альбо зусім адсутнічала, работа з беднатой. Неабходна гэты недахват выправіць. З.

Як праводзіцца беларусізацыя БДУ.

У справе беларусізацыі БДУ ёсьць пэўныя дасягненьні, але ў далейшым гэту справу трэба паглыбіць і ўзмацніць.—У справе беларусізацыі БДУ ёсьць фармальныя моманты.—Недапусьцімае зьявішча—сабаціраваньне беларусізацыі з боку студэнцкіх мас.—Беларусізацыі БДУ перашкаджае адсутнасьць падручнікаў на беларускай мове.

На пасяджэньні Нацкамісіі ЦВК БССР 29 сакавіка былі заслуханы даклады рэктара БДУ прафэсара Пічэты і адказн. сакратара Нацкамісіі тав. Будзіна аб ходзе беларусізацыі ў Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце.

Беларусізацыя БДУ пачалася яшчэ ў 1921 годзе. Праўленьне унівэрсытэту зрабіла ўсе захады да запрашэньня ў Менск з іншых месц расьпублікі навуковых супрадаўнікаў-беларусаў, але, на вялікі жаль, посьпехаў у гэтым кірунку пакуль што няма.

У першыя гады студэнцтва глядзела коса на справу беларусізацыі. Нават былі такія выпадкі, калі студэнты дэманстрацыйна пакінулі аўдыторыю, дзе лекцыя чыталася на беларускай мове. Аднак, ня гледзячы на падобныя дробныя факты, праўленьне унівэрсытэту выконвала загады ўраду БССР аб беларусізацыі БДУ. Паводле пастановы рэктарскай нарады, якая адбылася ў пачатку 1927 году, праўленьне БДУ патрабавала ад усіх асыстэнтаў і дацэнтаў пераходу ў працы на беларускую мову. Дзеля гэтага былі праведзены некалькі праверак ведаў беларускай мовы. Прафэсарскаму складу таксама было запрапанавана рашуча распачаць вывучэньне беларускай мовы, каб перавесьці ўсё выкладаньне на гэту мову. Найбольш слаба стаіць справа на мэдфаку, дзе большасьць прафэсуры—расейцы, але, аднак, і тут чытаюць ужо лекцыі на беларускай мове некалькі прафэсароў: Шапіра, прафэсар Кроль і інш.

Меры усяго беларусізаваны мэдфак, асабліва на вышэйшых курсах, але праўленьне БДУ пастанавіла не выдаваць дыплёмаў аб скончэньні унівэрсытэту, пакуль студэнт ня здасьць залікаў па беларускай мове.

На мэдфаку амаль усе прадметы чытаюцца на беларускай мове, за выключэньнем такіх прадметаў, як расейская літаратура і літаратура Заходняй Эўропы.

На яўрэйскім аддзяленьні мэдфаку лекцыі чытаюцца пераважна на яўрэйскай мове.

Зараз у БДУ стан беларусізацыі мае такі выгляд: на мэдфаку на беларускай мове выкладаецца 57 проц. усіх прадметаў, на мэдфаку—37,2 проц., на факультэце права і гаспадаркі—32,8 проц. і на рабфаку—90 проц.

Аднак, трэба адзначыць, што ў справе беларусізацыі ёсьць моманты чыста фармальнага характару. Напрыклад, на пасяджэньнях праўленьня БДУ, дакладчыкі на беларускай мове гавораць вельмі мала, а пераважна на расейскай мове. Таксама ў часе перарыву большасьць выкладчыкаў, што чытаюць лекцыі на беларускай мове, размаўляюць парасейску. Зусім слушна, што такія адносіны да беларускай мовы з боку прафэсарскага персаналу выклікаюць адпаведныя адносіны да беларускай мовы з боку студэнцкіх гушчаў. Але трэба адзначыць, што само студэнцтва косна адносіцца да беларусізацыі: да гэтага часу няма пералому ў бок рашучага і актыўнага правядзеньня беларусізацыі самой масай студэнцтва, а бяз гэтага ўсе захады праўленьня БДУ ў справе ўзмацненьня беларусізацыі ня будуць мець належных вынікаў. Калі справа беларусізацыі ў БДУ будзе развівацца тэмпам, які ёсьць зараз, то БДУ ня зможа беларусізавацца да тэрміну, г. з. да 1929 году. Навуковыя працаўнікі павінны больш актыўна ўзяцца за вывучэньне беларускай мовы; а другога боку, праўленьне БДУ павінна звярнуць большую увагу на высоўваньне на навуковыя пасады беларусоў і ўраджэнцаў Беларусі.

Галоўнай перашкодай у справе беларусізацыі БДУ зьяўляецца адсутнасьць падручнікаў на беларускай мове. Да гэтага часу студэнцтва карыстаецца расейскімі падручнікамі, і, безумоўна, гэта адбіваецца на тэмпе беларусізацыі. З другога боку, трэба зьвярнуць увагу на больш хуткую выпрацоўку тэрміналёгіі і адпаведных дысцыплін, бо ёсьць выпадкі, калі з прычыны адсутнасьці выпрацаванай тэрміналёгіі на некаторых катэдрах не рашаюцца перайсьці да выкладаньня на беларускай мове. Трэба зараз-жа распачаць падрыхтоўку падручнікаў на беларускай мове.

* * *

У абмене думкамі выступала шмат таварышоў.

Тав. Абрамчук адзначыў вялікі пералом у справе беларусізацыі БДУ. Арганізацыйная праца пастаўлена добра і зараз толькі трэба паглыбіць гэту справу і паскорыць тэмп.

Толькі пры такіх умовах БДУ зможа да вызначанага тэрміну поўнасьцю беларусізавацца. У далейшым трэба зьвярнуць увагу на падрыхтоўку падручнікаў на беларускай мове.

— Я лічу, — кажа т. Абрамчук, — што праўленьне БДУ павінна выдаць такую пастанову, што навуковыя працаўнікі, большменш уладаючыя беларускай мовай, павінны абавязкова ўжываць яе як на лекцыях, так і ў штодзённым жыцьці.

Наогул, трэба перастаць насіцца з пытаньнем вывучэньня нацыянальнасьці; справа гэта ўжо вывучана і яе трэба рашуча праводзіць у жыцьцё.

Тав. Сташэўскі лічыць, што беларусізацыю трэба праводзіць больш рашуча і ўпарта: пераломам ужо ёсьць у гэтай справе. Але зараз трэба звярнуць увагу на якасьць беларускай мовы, трэба, каб навуковыя працаўнікі навучыліся дасканала ўжываць беларускую мову.

Па думцы т. Унароўскага наша студэнцтва павінна адмовіцца ад гіранічных і жартлівых адносін да пачынаючых чытаць лекцыі на беларускай мове навуковых працаўнікоў. Студэнцтва павінна зразумець, што адразу ніхто ня зможа навучыцца прыгожа гаварыць набеларуску і тут патрэбна чулая дапамога з боку самога студэнцтва да гэтай справы.

— Пытаньне аб беларусізацыі БДУ,—кажа т. Хацкевіч,—паўстала ў зьвязку з артыкуламі і нататкамі, зьмешчанымі ў газэце «Савецкая Беларусь», у якіх былі адзначаны адмоўныя бакі ў справе беларусізацыі БДУ. Але, як відаць з дакладаў, у справе беларусізацыі ёсьць, аднак, і значныя дасягненьні.

Трэба адзначыць невыстарчальны тэмп у справе беларусізацыі, што тлумачыцца адсутнасьцю патрэбнага ліку навуковых працаўнікоў, недаючых беларускую мову, марудлівасьцю працы па выданьні тэрміналёгіі і, галоўным чынам, адсутнасьцю падручнікоў на беларускай мове.

Тав. Хацкевіч падкрэсьліў ролю і ініцыятыву, якую праяўляе ў справе беларусізацыі рэктар унівэрсытэту прафэсар Пічэта. У гэтай працы рэктар Пічэта і ўсё праўленьне БДУ заўсёды будзе мець рашучае падтрыманьне з боку ўраду БССР.

Прамоўца спыніўся на ненармальных адносінах да справы беларусізацыі некаторых маладых выкладчыкаў і студэнцтва.

У той час, кажа т. Хацкевіч, калі некаторыя старыя прафэсары (праф. Мелкіх і інш.) заўзята вывучаюць беларускую мову, частка больш маладых выкладчыкаў пасьўна адносіцца да гэтай справы. Да апошняй катэгорыі працаўнікоў трэба ўжываць больш рашучыя меры.

Зусім недапусьцімае зьявішча, што з боку студэнцтва назіраюцца адмоўныя адносіны да справы беларусізацыі. Наша студэнцтва павінна зразумець, што яно рыхтуецца для культурна-гаспадарчай працы сярод таго насельніцтва, асноўную масу якога складаюць беларусы. І, зразумела, што працаўнік, які ня ведае мовы таго народу, сярод якога яму прыходзіцца працаваць, ня можа прынесьці належнай карысьці.

У адносінах да тых студэнтаў, якія ня хочуць вывучаць беларускую мову, трэба ўжываць самыя рашучыя, рэпрэсіўныя меры. Лепш зараз выключыць студэнта з унівэрсытэту, чым зьвінаць такога працаўніка з работы за нежаданьне вывучаць беларускую мову пасьля скончэньня унівэрсытэту.

Хто ня хоча вывучаць беларускае мовы, таму ня месца ў нашым унівэрсытэце.

Урэшце, т. Хацкевіч лічыць патрэбным больш ўдзел працаўнікоў унівэрсытэту ў тэрміналёгічнай працы ІБК.

Да 2-га Усесаюзнага конкурсу на лепшае с.-г. крэдытнае таварыства.

Правільнае набудаваньне і арганізацыя с.-г. крэдытнага т-ва зьяўляецца адной з асноўных задач, якія ставіць партыя і ўрад у адносінах да вёскі.

У сувязі з гэтым асаблівае значэньне набываюць мерапрыёмствы, якія дапамагаюць ўхіленьню існуючых хібаў у працы с.-г. крэдытных таварыстваў і выяўленьню посьпехаў, дасягнутых асобнымі таварыствамі.

Да ліку гэткіх мерапрыёмстваў адносіцца і арганізацыя штогодных конкурсных іспытаў, якія праводзіць наркамфін СССР супольна з цэнтр. С.-Г. банкам, Саюзам Саюзаў с.-г. кааперацыі і Ўсекамбанкам.

Першы конкурс, арганізаваны ў 1926-27 г., прайшоў вусім здавальняюча. Ад БССР у гэтым конкурсе ўдзельнічалі 4 таварыствы, з якіх адно атрымала грашовую прэмію і адно—пахвальны водзыў.

Для правядзеньня ўсесаюзнага конкурсу ў бягучым годзе пры НКФ БССР арганізуецца рэспубліканская конкурсная камісія, а таксама і акруговыя камісіі.

У конкурсе могуць удзельнічаць усе с.-г. крэдытныя таварыствы, якія працуюць ня менш году.

Таварыствы, якія хочуць прыняць удзел у конкурсе, павінны накіраваць у мясцовыя акруговыя конкурсныя камісіі пры акрфінаддзелах заявы з далучэньнем: а) балянсу на 1-е чысло месяца, у які падасьцца заява; б) гадавой справаздачы за 1926-27 апэрац. год; в) статуту; г) спэцыяльнай анкеты і д) іншых матар'ялаў характарызуючых дзейнасьць т-ва.

Для прэміраваньня лепшых т-ваў устанаўляюцца прэміі: 3 першага разраду—па 2000 руб., 8—другога разраду—па 1000 руб. і 23 прэміі трэцяга разраду—па 500 рублёў. Апроч таго, будуць выдавацца спэцыяльныя пахваленьня водзывы. А. Л.

На беларускіх зямляцтвах.

У гарадох іншых савецкіх рэспублік зараз існуе 5 беларускіх студэнцкіх зямляцтваў: Маскоўскае, Кіеўскае, Ленінградзкае, Смаленскае і Вароненскае. Апрача гэтага, у шэрагу вузаўскіх гарадоў (Саратаў, Омск і інш.) арганізуюцца ініцыятыўныя групы студэнтаў-беларусаў, якія імкнуцца заснаваць беларускія зямляцтвы і праз іх наладзіць сувязь з БССР.

У большасьці сваёй існуючыя зямляцтвы—маладыя, нядаўна арганізаваныя; толькі адно Маскоўскае налічвае ўжо 5 год свайго існаваньня і працы.

Аснаўным недахопам амаль усіх зямляцтваў зьяўляецца недастаткове правядзеньне масавай працы.

* * *

Беларускае зямляцтва ў Маскве—самае буйное: у яго шэратах налічваецца 920 студэнтаў-беларусаў, што складае 30 проц. усіх беларусаў, якія навучаюцца ў Маскоўскіх ВНУ. Значная колькасьць землякоў—82 проц.—забясьпечана дзяржаўнай стыпэндыяй. 91 проц. удзельнікаў зямляцтва зьяўляюцца членамі прафсаюзаў; мы маем таксама добры сацыяльны склад: 36 проц. рабочых і 46 проц. сялян (66 проц. беларусаў і 31 проц. яўрэяў).

Зямляцтва падтрымлівае сувязь з Наркамасьветы, Дзяржплянам і Эканамічнай Нарадай БССР па пытаньнях эканомікі і будаўніцтва Беларусі ў сувязі з дыплёмнымі працамі і практыкамі, якія студэнты-землякі бяруць на беларускія тэмы. Пры зямляцтве арганізаваны краязнаўчыя дыплёмныя і навукова-дасьледчыя гурткі; працуе беларускі хор; ёсьць бібліятэка, якая налічвае 1112 белар. кніг. Сябры зямляцтва прымаюць актыўны ўдзел у працы Маскоўскага Беларускага Клюбу. Падтрымліваецца шчыльная сувязь з сталым прадстаўніцтвам Беларусі пры ўрадзе СССР.

Зямляцтва атрымлівае для сваёй працы грашовую дапамогу ад Наркамасьветы Бел., якая ў бягучым годзе складае 11.500 рублёў, апрача персанальных стыпэндый і выдаткаў на клюбу.

* * *

Беларускае зямляцтва ў Кіеве—невялічкае, яно налічвае ўсяго 65 студэнтаў з агульнага ліку 250 беларусаў, навучаючыхся ў Кіеве. Пры зям-ве арганізаваны гурткі—беларускай літаратуры і краязнаўства. Працы зямляцтва перашкаджае адсутнасьць неабходнай матар'яльнай базы. Так, у мінулым годзе яно атрымала субсыдыю ўсяго ў суме 300 рублёў. Тым ня менш зямляцтва выяўляе сабой дружную сям'ю.

Прафэсура аказвае зямляцтву ўсебаковае маральнае падтрыманьне. У апошнія часы зямляцтва пачынае больш шырока разгортваць сваю працу.

* * *

Беларускае зямляцтва ў Ленінградзе складаецца з 360 сябраў у той час, як у Ленінградзе навучаецца звыш 2.000 студэнтаў-беларусаў. На бягучы год зямляцтва атрымала 650 руб. на культ. і арганізацыйную працу. Ленінградзкае зям-ва—самае слабое: хоць і арганізаваны 4 гурткі (літаратурны, драматычны), але яны не працуюць; амаль не вядзецца масавая праца; слаба падтрымліваецца сувязь з БССР. Назіраецца вельмі слабая актыўнасьць з боку сяброў зямляцтва.

У заслугу зямляцтва трэба паставіць адчыненьне ў Ленінградзе беларускага клюбу.

* * *

Белар. зямляцтвы ў Смаленску і Вароненшы яднаюць разам звыш 300 сяброў; наладжана і больш-менш вядзецца праца розных гурткоў па вывучэньні мовы, культуры, эканомікі, прыродных багацьцяў Беларусі, асабліва ў Смаленскім. Вядзецца культурная праца сярод сяброў зямляцтва, арганізуюцца вечары. Гэтыя зямляцтвы атрымліваюць праз Наркамасьветы ў сярэднім па 500 рублёў у год матар'яльнай дапомогі.

—

Зямляцтвы рэгулярна атрымліваюць беларускія газэты і часопісі, арганізаваны невялічкія бібліятэчкі з кніг на пытаньнях будаўніцтва БССР і беларускай літаратуры.

Хворым пытаньнем для сяброў зямляцтваў зьяўляецца неўрэгуляванасьць справы нармальнай практыкі ў межах БССР, куды яны імкнуцца на працу.

Усе зямляцтвы яднаюць каля 1700 студэнтаў-беларусаў, якія рыхтуюцца да працы на Беларусі. Т. Л.

АБ КАНТРАКТАЦЫІ ПРАМЫСЛОВЫХ КУЛЬТУР У 1928 г.

Пастанова Эканамічнай Нарады пры СНК БССР.

1. Устанавіць наступныя разьмеры кантрактацыі насеваў прамысловых культур на БССР:

а) лёну на валакно — 20000 гэкт. з таварным выхадам валакна 43400 цэнт. (каля 35 проц. таварнасьці);

б) льна-семя—10000 гэкт. з выхадам прадукцыі ў 18300 цэнт. (каля 5 проц. таварнасьці);

в) бульбы—6500 гэкт. (для Белсельтрэсту—2000 гэкт.); Белдзяржспірту—3250 гэкт. і Белхарчтрэсту—1250 гэкт. з таварным выхадам каля 300000 цэнт. (каля 25 проц. патрэбнасьці прамысловасьці);

г) піваварнага ячменю—3000 гэкт. з выхадам каля 15000 цэнт. прадукцыі.

2. Разьмеркаваньне насеўнай плошчы, падлягаючай кантрактацыі, вытвараецца ў адпаведнасьці з райёнамі прамысловага распаўсюджваньня культур і перспэктывамі разьвіцьця сельскае гаспадаркі ў гэтых райёнах:

а) паміж акругамі НК Гандлю па ўзгадненьні з НКЗемам, Белсельсаюзам і Белсельбанкам і зацікаўленай прамысловасьцю;

б) на асобных райёнах—Акрсельсаюзамі не пазьней 15-III г. г. разам з Акрза, Акрсельбанкамі і Акр. Гандлем, якое разьмеркаваньне зацьвярджаецца Акрвыканкомамі.

Кантрактацыя бульбы праводзіцца ў райёнах заводаў па пераапрацоўцы бульбы. Разьмеркаваньне-ж плошчаў у кантрактацыі па акругах і райёнах — вытвараецца Белсельсаюзам разам з НКЗемам, Белдзяржспіртам, Белхарчтрэстам і Белсельтрэстам.

Устанавіць наступныя разьмеры аванса ваньня кантрактацыі:

а) для бяднацкіх гаспадарак, якія карыстаюцца ільготамі па сельска-гаспадарчаму падатку, або ня маюць уласнай рабочай жывёлы, ці інвэнтару для правядзеньня насеваў, і для калектыўных гаспадарак на льнавалакну—30 р. на гэкт.; на льнасемені—12 р. на гэкт.; на бульбе—40 руб. на гэкт. і па піваварнаму ячменю—19 р. на гэкт.;

б) для сераднякіх гаспадарак па льнавалакну—27 р. за гэкт.; па льнасемені—10 р. на гэкт.; на бульбе—35 р. на гэкт. і на піваварнаму ячменю—16 р. на гэкт.;

в) для заможных—па льнавалакну—23 р. на гэкт.; на льнасемені—8 р. на гэкт.; на бульбе—30 руб. на гэкт. і па піваварнаму ячменю—13 р. на гэкт. Найменшым разьмерам кантрактуемай плошчы для лёну-валакну лічыць 1/6.

4. У мэтах больш пасьпяховага правядзеньня агрыкультурных мерапрыёмстваў па навялічэньню ўраджайнасьці і палепшаньня кантрактуемых насеваў, лічыць неабходным кантрактаваць насевы пераважна гібэздамі, г. зн. на магчымасьці захаляць у гэту справу цэлыя насяленьні.

5. Патрэбныя для правядзеньня кантрактацыі сродкі вылучыць:

а) па льнавалакну Дзяржбанк і Белсельбанк—540 тыс. руб.;

б) па льнасемені—Белхарчтрэст—65 тыс. руб. і Белсельбанк—25 т. р.;

в) па бульбе—Белдзяржспірт—90 т. р., Белсельтрэст—55 т. руб., Белхарчтрэст—32,5 т. р. і Белсельбанк—50 т. р.;

г) па ячменю—Белхарчтрэст—33 т. р. і Белсельбанк—15 тыс. руб.

6. У мэтах больш пасьпяховага правядзеньня кантрактацыі насеваў, разьмяркоўваць пераважна сярод кантрактуючых насевы палепшаных насенных матар'ялаў, штучныя ўгнаеньні і с. г. машыны і прылады, а таксама крэдыты на пакупку с.-г. інвэнтару палепшанага насеньня і штучных угнаеньняў, захоўваючы сыстэму крэдытаваньня сялянскіх гаспадарак па іх сацыяльнаму становішчу.

Акрамя таго, лічыць неабходным спабяжаць у першую чаргу пастаўнікоў льна-валакна таксама і мануфактурай, а ў райёнах з недахватам уласнай прадукцыі хлеба забясьпечыць іх хлебам у разьмерах кантоўнасьці ўданага валакна, але ня больш спажывецкіх патрэб дапай гаспадаркі.

7. У мэтах забясьпечаньня закантрактаваўшых свае насевы палепшаным насенным матар'ялам:

а) вытвараць водпуск насеньня лёну-даўгунцу як прадажай, так і абменам адпаго пуду даўгунцу на адзін пуд 8 фунтаў мясцовага ільна-семені.

Прадажную цану на насеньне ільну-хаўгунцу ўстанавіць у 12,9 кап. за кілёграм (2 р. 10 кап. пуд.); у выпадку маючых быць ад гэтага страт, даручыць НКГандлю і НКФ. Спраў вызначыць разьмер гэтых выткаў і забясьпечыць пакрыцьцё іх згодна пастановы СНА за 14-X 1927 г.

б) у райёнах кантрактацыі льнасемені абавязаць Белсельсаюз не пазьней 11-III--23г. вылучыць 2,5 тыс. пудоў мясцовага насеўнага насеньня лёну для забясьпечаньня насенным кантрактуючых свае насевы.

Прадажную цану на гэта насеньне ўстанавіць у 2 кап. за пудапроцант. дабротнасьці з налічэньнем наддачы ў 15 кап. за пуд.;

в) для забясьпечаньня насеўшчыкаў палепшанай насеннай бульбай—прапанаваць Белсельтрэсту, Белдзяржспірту і Белхарчтрэсту ўтварыць на будучы час пры кожным заводзе фонд палепшанай насеннай бульбы, разьмер якога павінен быць вызначаны НКЗемам разам з зацікаўленымі ўстановамі.

У цяперашнюю пасеўную кампанію арыентывочна вылучыць па 2.000 пуд. палепшанай бульбы на кожны завод.

Пры выдачы авансаў насеннай бульбай аплочваю даваць па цэнам, па якім саставнік здае сваю бульбу па дагавору;

г) для забясьпечаньня пасеўшчыкаў насеньнем піваварнага ячменю ў разьмерах 15.000 пуд. прапанаваць Белсельсаюзу скарыстаць у першую чаргу ячмень, атрыманы ад савгасаў, і ў другую—ячмень мясцовай нарыхтоўкі.

Прадажную цану на гэты ячмень устанавіць у 1 р. 25 кап. за пуд, пры гэтым страта ад продажы Белсельтрэстам на пніжанай цане пакрываецца Белхарчтрэстам.

8. Агульнае кіраваньне па правядзеньню кантрактацыі пасеваў прамысловых культур усклаць на НКГандлю. Кантрактацыя па ільну і ячменю праводзіцца, як правіла, праз сыстэму сельска-гаспадарчай кааперацыі. Парадак на кантрактацыі бульбы ўстанаўляецца НКГандлю па ўзгадненьні з зацікаўленымі ўстановамі і арганізацыямі.

9. Выдачу авансаў па дагаворах вытвараць у разьмеры: 75 проц. пры подпісу пастаўніком дагавору і 25 проц. пасьля праверкі пасеву, але не пазьней 1-га чэрвеня.

Гэта выдача вытвараецца як грашыма, так і насенным пасеўным матар'ялам. Аванс выдаецца бяспроцэнтна.

10. Патрэбныя на правядзеньне кантрактацыі грошы Дзяржбанк дае па спэцыяльнаму бягучаму рахунку з пакрыцьцём процантаў пры пагашэньні доўгу, прычым 1 проц. перадаецца Белсельбанку ў гарантыйны фонд і 0,5 проц. ад сумы выдадзенага авансу налічваецца на арганізацыйныя выдаткі Белсельбанку. Парадак пакрыцьця гэтых крэдытаў устанаўляецца НКГандлю і НКФраш. Спраў.

11. Тэрміны здачы пастаўнікамі прадуктаў устанавіць наступныя:

а) для льна-валакну: лістапад—35 проц., сьнежань—40 проц. і студзень—25 проц.;

б) для льна-семені: [illegible] кастрычніку—50 проц. і ў лістападзе—50 проц.;

в) для бульбы: у кастрычніку 50 проц. і ў лістападзе—50 проц.;

г) для ячменю: кастрычнік—30 проц. лістапад—40 проц. і сьнежань—30 проц.

12. Для разрахунку з пастаўшчыкамі на закантрактаваныя прадукты устанавіць наступныя цэны:

а) лён-валакно—існуючыя цэны гэтага году;

б) льно-семя—2 кап. пуда-прапант дабротнасьці франка-склад с. г. таварыства ў 5-вёрстым радыусе ад чыгуначнай станцыі, ці франка-завод;

в) для бульбы ня ніжэй 28 кап. за пуд франка-завод з тым, што канчатковыя цэны свячасова ўстанаўліваюцца НКГандлю па райёнах з улікам ураджайнасьці мясцовых умоў сельскай гаспадаркі;

г) для піваварнага ячменю—1 р. за пуд франка-склад с.-г. таварыства ў 15-вёрстным радыусе ад чыгуначнай станцыі, ці франка-завод.

Аплата за здаваны прадукты вытвараецца с.-г. таварыствамі ў дзень здачы маньшым прапарцыянальна выданаму, але з тым, аднак, каб увесь [illegible] пагашан не пазьней 31 сьнежня [illegible]

Увага: У выпадку, калі [illegible] НКГандлю на прапазыцыі існаваньня дагавору павысіць цэны на закантрактаваныя прадукты, дык гэта надвышэньне распаўсюджваецца на ўсю колькасьць прадуктаў, як ужо зданых, так і падлягаючых здачы па дагавору.

13. У выпадку, калі пасеўшчык не [illegible] гэту паказаную ў дагаворы плошчу, ён павінен [illegible] вартыству аванс [illegible] давых за ўвесь [illegible], акрамя таго, [illegible] жаве, падлягае [illegible] чых законаў.

Калі-ж пасеўшчык [illegible] рыству па дагавору [illegible] вінен зьвярнуць [illegible] жа 12 проц. і з [illegible] меры 25 проц.

Увага: У выпадку [illegible] мчасьця пасеўшчык [illegible] уплаты наўстойкі і за выдадзены аванс, які ён павінен зьвярнуць—плаціць 6 проц.

14. У выпадку стыхійнага няшчасьця, пашкодзіўшага пасевы, пастаўшчык павінен па працягу 7 дзён паведаміць с.-г. таварыства, якое пры ўдзеле сельсавету складае акт аб шкодзе і прадстаўляе яго ў Акрсельсаюз.

15. Даручыць Белсельсаюзу не позьней 1 лістапада г. г., пры ўдзеле райвыканкому, сельсавету і райённых агранамаў, правесьці праверку выкананьня пасеўшчыкамі ўзятых на сябе па дагавору абавязацельстваў.

16. Прапанаваць НК Гандлю і Белсельсаюзу не позьней 10-III 1928 г. канчаткова распрацаваць і ўгадніць з зацікаўленымі ўстановамі тыпавыя дагаворы па кантрактацыі насеваў.

17. На падставе выкладзенага даручыць Белсельсаюзу не позьней 20-III-28 г. пачаць заключэньне дагавораў па кантрактацыі з асобнымі сялянскімі гаспадаркамі.

18. Прапанаваць Белсельсаюзу і Белсельбанку ўстанавіць нагляд за больш правільным разьмеркаваньнем крэдытаў, якою прызначаных для кантрактацыі сродкаў з тым, каб адпускаемыя пазыкі ня выходзіліся з сапраўдных разьмераў засяваемай плошчы, папярэджваючы пры гэтым выпадкі выдаткаваньня крэдытаў сверх адпускаемых на кантрактацыю сродкаў не на тое прызначэньне, на якое яны пушчаны.

19. Лічачы неабходным пры кантрактацыі насеўнага матар'ялу, чыц НКЗему ў 2-хдзённы тэрмін у Дзяржплян плян кантрактацыі насеўнага матар'ялу.

20. Прызнаючы мэтазгодным разьвіваць папярэдняй закупкі на корні кааперацыяй ураджаю яблык у калхозах і садова-агародных таварыствах, прапанаваць Белсельбанку крэдытаваць гэтыя аперацыі з агульнага сродкаў на кароткатэрміновану крэдыту.

21. Для выкананьня дагаворных абавязацельстваў Белсельсаюзам па забясьпечаньню пастаўшчыкоў льна-валакна хлебам-мануфактурай, прасіць НК Гандлю СССР аб вылучэньні спэцыяльнага фонду для БССР у разьмерах: жыта і жытняй мукі 1500 вагонаў і мануфактуры 50 вагонаў.

22. Прапанаваць Белсельтрэсту для ніпаваранай прамысловасьці засевы у пасеўную кампанію гэтага году 1000 гэктараў піваварнага ячменю.

23. Даручыць НК Земляробства разам з ВСНГБ распрацаваць у тыднёвы тэрмін парадак утварэньня скарыстаньня спэцыяльнага фонду, які закладзен на мэты агрыкультурнай дапамогі сельскай гаспадарцы са збораў з прамысловых прадпрыймстваў, пераапрацоўваючых с.-г. сыравіну і гатовых арганізацый.

24. Даручыць НКЗему прадугледзіць у плане снабжэньня сельскага насельніцтва насеннымі матар'ялямі, таксама [illegible] льнаводаў дрывамі для сушкі льну, асабліва кантрактуючых свае насевы.

Старшыня Эканамнарады пры СНК БССР М. [illegible]

Нам. Кіраўніка С[illegible] і Эканамнарады [illegible]

5-III 1928 г.

ЧЫРВОНАГВАРДЗЕЙСКІЯ ФАРМІРАВАНЬНІ У МАГІЛЕВЕ-СТАУЦЫ.

(Зарысоўкі-эпізоды).

Наш на[illegible]ыс, прысьвечаны чырвонагвардзейскі[illegible] фарміраваньням у Магілеве-стаўцы [illegible] вярхоўнага галоўнакамандуючага, [illegible] павінны пачаць са сьнежня 1917 [illegible]оду, калі ўпярыміну на вуліцах на[illegible]нага гораду, які ўжо бачыў віды [illegible] на сваіх вяку, зьявіўся кабачны д[illegible]агэтуль экземпляр:

Заводзкі [illegible] рабочы са стрэльбаю за плячыма, [illegible]увесь абвешаны кулямётнымі лентамі, [illegible] з нагэнам за паясом.

Яны, [illegible]тыя ўзброеныя рабочыя, сыны пст[illegible]радзкіх фабрык і заводаў, прышлі [illegible]ды разам з матроскімі атрадамі вярхоўнага галоўнакамандуючага К[illegible]ленка і, побач з імі, яны зьяўляліся вострым кантрастам, які быццам [illegible]аварыў усім і кожнаму:

Вось [illegible]ты шырокагрудны плячысты матрос, [illegible]увесь абвешаны морам-акіянам, зьяўляецца выхаванцам воднай стыхіі, узросшы і загартаваны на яе бязьмежнай [illegible]шырыні, ускормлены і ўспоены яе с[illegible]малістым пахам.

Яго га[illegible]тавалі буры-вятры; мора надало яму [illegible]адвагу, і ён з ног да галавы—сапраўдны [illegible]магутнай фізычнай сілы.

У гонар вялікага пралетарскага пісьменьніка.

(Урачысты сход, прысьвечаны 60-цігодзьдзю М. Горкага).

29 сакавіка ў кіно «Культура» адбыўся шматлюдны ўрачысты сход, прысьвечаны 60-гадоваму юбілею пралетарскага пісьменьніка М. Горкага.

— 60-гадовы юбілей вялікага пралетарскага пісьменьніка М. Горкага мае асаблівае значэньне для працоўных Савецкага Саюзу.

Роўна 60 год таму назад у Ніжнім Ноўгарадзе ў Максіма Няшкова нарадзіўся адзін з буйнейшых пралетарскіх пісьменьнікаў. Сёньня ва ўсім вялізарным Савецкім Саюзе на старонках газэт, у рабочых клюбах, у хатах-чытальнях на расейскай мове і на мовах усіх народаў, вызваленых з аковаў уніску, гавораць аб Горкім, шлюць яму свае вітрыя прывітаньні.

Горкага ведаюць усе народы сьвету і таксама адзначаць яго юбілей. Але асабліва гучнае прывітаньне пісьменьніку пралетарыяту на далёкіх акраінах, сярод бядольных і прыгнечаных, якім прысьвечаны творы і жыцьцё М. Горкага.

З імем Горкага зьвязана цэлая літаратурная эпоха. Горкі пачаў пісаць у гады вканамічнага перадому, калі капіталістычныя элементы перамагалі фэадальна-памешчыцкі лад, калі на грамадска-гістарычную арэну выступала новая кляса—пралетарыят.

Голас пісьменьніка магутна гучэў разбуджаньні встамі ў дні нарастаньня рэвалюцыйных настроеў, ён ня сьціхаў і ў дні чорнай рэакцыі нарэшце, які дажываў свае апошні дні.

Цяпер, жывучы ў далёкай фашыстаўскай краіне—Італіі, куды закінула яго цяжкая хваробаць, Горкі адкрыта кідае ў твар буржуазеі абвінавачаньне ў яе подласьцях, адзначаючы выказваючы захапленьне з поваду посьпехаў пралетарыяту СССР і адзначаючы з рэвалюцыйна-будаўнічай працай пралетарскай дыктатуры.

Было ня мала таленавітых мастакоў, якія ў той ці іншай ступені сутыкаліся з рэвалюцыйным рухам у Расеі: Андрэеў, Купрын, Чырыкаў. А дзе яны цяпер? Яны дажылі ці дажываюць свае дні сярод белай эміграцыі, вырекаючы супроць буйнай заваёвы рэвалюцыі, супроць краіны Саветаў. Толькі Горкі вытрымаў экзамен у агні рэвалюцыі, толькі ён адзін атрымаў сусьветную вядомасьць у дарэвалюцыйнай Расеі.

* * *

Пасьля ўрачыстай "часткі ў „Культуры" была паладжана кіно-пастаноўка „Мать", якая зложана рэжысэрам Ус. Пудоўкіным па сцэнарыю М. Горкага.

Надзвычайная стужка. Шэдэўр савецкай кінематаграфіі. Высока-мастацкі твор. Прасачыўшы фільм, бачыш вялікую закаханасьць сцэнарыста да клясы працоўных і агідвасьць і нянавісьць да буржуазеі яе прыслугачоў—паліцэйскіх.

Гэтая закаханасьць да працоўных і нянавісьць да буржуазеі Ус. Пудоўкіным апранутыя ў высокамастацкія формы, дзякуючы чаму лёгка і яскрава западаюць у памяць гледача.

Аб чым думаюць рабочыя і сяляне, кінутыя ахранкаю ў царскія казэматы? Яны думаюць пра молат і накавальню, пра саху і каласістае поле.

Пра што гутараць царскія стаўленікі—суддзьдзі, апраўаючы форменны сурдут, каб ісьці ў судовую залю і судзіць рэвалюцыянэра Паўла? Яны гавораць пра гатункавую кабылу: кабыла ня выходзіць з галавы «яго прэвасхадзіцельства» нават і ў судовай зале, у часе прамовы абаронцы. І тут старшыня суду, закрыўшыся вокладкай, выводзіць «прыгожыя» контуры гатункавай кабылы.

Пра што думае матка, якая толькі што выпусьціла з рук забітага паліцэйскімі каханага сына? Яна думае пра чырвоны штандар, за гонар і перамогу якога аддаў жыцьцё ён каханы сын.

Гэтыя моманты наказаны ў фільме так моцна, што даволі ўбачыць іх адзін раз, і на ўсё жыцьцё застанецца ў душы замілаваньне да прыгнечаных працоўных, прагнасьць да змаганьня за праўду, агіда да царскага ладу і да яго душыцеляў-паліцэйскіх.

С. Азерскі.

„Фауст" у пастаноўцы Белмузтэхнікуму.

29-га сакавіка адбыўся доўгачаканы першы паказ пастаноўкі Беларускім Дзяржаўным Музычным Тэхнікумам оперы „Фауст" (музыка Ш. Гуно, лібрэтта Барбе і Кара, пераклад на беларускую мову Ю. М. Дрэйзіна).

Белмузтэхнікум яшчэ раз яскрава паказаў, што ён ёсьць сапраўднае дзіцяё рэвалюцыі, што ў ім ідзе вялікая і напружаная праца.

І гэтая праца дала адпаведныя вынікі.

[illegible] пастаўлена ў новым сцэнічным [illegible] Беларускім М. М. Вастокавым (кі[illegible] сцэнічнага выхаваньня). Рэ[illegible] настаўнічык М. Вастокаў паказаў [illegible] праўдзівым і таленавітым мастаком. [illegible] сцэнічныя малюнкі былі надзвычайна [illegible]

[illegible] выяўлялася ў мастацка праду[illegible] экаранных, у мастацкіх разьмер[illegible] мізансцэн, у сцэнах масавых і [illegible] адзельнікаў. Спаміж дэ[illegible] бліва прыгожымі былі дэкара[illegible] храма і турмы. Ва ўсім ходзе оперна[illegible] паказу адчувалася праца і кіраўніцтва [illegible] рэжысэра, праўдзівага маста[illegible]. Спаміж масавых сцэн надзвычайна ўда[illegible] сцэна на вяшчы (вальс).

Пераходзячы да паасобных бакоў спэк[illegible]лю, трэба перш за ўсё, адзначыць [illegible] - ігру маладых артыстых, [illegible] яны выстаўлены былі клясаю прафэса[illegible] Цыпатова: Маргрэта—Александ[illegible] Марта—Леві[illegible] Заладзько (ма[illegible]), Валянтын [illegible]. За два га[illegible] зрабіў вя[illegible] добра выка[illegible]чнасьць вы[illegible]

[illegible]ычнага боку, [illegible]ўсе артысты [illegible] на месцы, ха[illegible]ольнавай сту[illegible]ліла шматліка[illegible]шоў з „аншлягам"] [illegible] чарнымі голасамі, так і праўдзіва [illegible]стакжай ігрой, глыбокай прадумванасьцю [illegible] ролі.

Гета была сапраўдная Мальргэта [illegible] ўсёй [illegible] жаноцасьцю, паэтычнасьцю, гэраічнай [illegible]данасьцю, глыбінёю пачуцьця. У асобе [illegible]ксандроўскай мы маем бязумоўна буду[illegible]чую вельмі выдатную сілу, якая ўжо цяпер умее заўладаць слухачом, увага якога не аслабляецца ні на момант і які разам з артысткаю жыве і адчувае.

На значнай вышыні быў Мэфістофэль—Фауст. З боку вольнасьці сцэнічных рухаў ён нават быў бадай ці ня вышэй за ўсіх маладых артыстых. Сакавіта гучэў яго голас, была і ў ім і дэмонічнасьць. Асабліва добра ўдаліся яму куплеты аб залатым куміры і пагровы ў сцэне перад царквой.

Бязумоўна добра яёў сваю ролю Фауст, як стары [Лоткер], так і малады (Валадзько). Абодвы паказалі добрыя галасы, а ў пяяньні маладога Фаўста было шмат паэтычнасьці, хоць і малавата тэмпэраманту.

Слухачка Левіна дала праўдзівы сьмешны вобраз пусьценькай кумкі Марты.

Добра трымаўся і Багнэр - Самойлаў, уноўне здавальняюча правяді свае ролі Зібэль—Ніборская і Валянтын—Салохін. З немалым уздымам і экспрэсіяй правёў апошні сцэну сьмерці і праклёну Мальргэты.

Нельга не адзначыць мастацкага пяяньня хору (кляса наст. Мацісона). Пачынаючы ад першага хору (жаночага) за сцэнай у праёгу да апошняга (у сцэне ня царквы, таксама за кулісамі), хор як у сваіх паасобных часьцінках, так і ў поўным складзе гучэў чыста, стройна, дысцыплінавана.

Дырыгаваў операй кіраўнік аркестровае клясы тэхнікуму І. А. Гітгарц. Сваю ролю ён правёў вельмі здольна, умела і цьвёрда. Чыста, ясна, мастацка была выказана увэрцюра. На працягу ўсяго паказу аркестр гучэў вельмі прыемна, ніводнага гуку сьпевакоў-сал стых не гублялася, і ансамбль між сцэнай і аркестрам быў бездакорны.

Пяройдзем да хіб паказу.

Нельга згадзіцца з выдаленьнем у паасобны малюнак арыі Валянтына („Божа ласкі і любві») і пераносам яго ў пачатак 1-е дзеі, бо тут ён ня мае ніяк сувязі з папярэднім і наступным ходам дзеі і стаіць ніяк «з боку—прыпёку».

Другая хіба: куліраваны быў зварот войск (з Валентынам). Марш выконваўся ня хорам, а аркестрам і „бандай" [цухавы аркестр] за спушчанай заслонай.

Пажадаем тэхнікуму далейшых посьпехаў у яго слаўнай і карыснай працы.

Е. Ж.

Ў ЎСЕ АДНОЛЬКАВА ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ.

Вясковае настаўніцтва атрымлівае [illegible] на дзьвердых стаўках. Зусім інакш справа абстаіць з настаўнікамі дзіцячых дамоў.

Узяць хоць-бы для прыкладу дзетдомы Чэрыкаўскага раёну, Магілеўскае акругі, і параўнаць працу школы пры гэтых дзетдамох з працай сясковых школ.

Пры дзетдоме школа пачынае працаваць з 15-га верасьня і працуе да 5-га мая, і працуе ў працягу 8-мі [illegible] без ніякага перапынку, бо ні [illegible]ковых, ні вясновых канікул няма. [illegible]вясковых школах куды больш вольнага часу. Калі-ж узяць аплату пэд[illegible], дык выходзіць, што настаўнік пры [illegible]доме атрымлівае 36 руб. Можа на[illegible]ры дзетдоме лічыцца нейкай [illegible]гэрый, якая можа праца[illegible]шую аплату?

[illegible] было-б паслухаць тлумачэньні [illegible]ных органаў.

Івашын.

Апавяшчэньні.

—Праўленьне студ. навукова-дасьледчага [illegible]га т-ва БДУ і ЦБК даводзяць да ведама [illegible]ухгчоў і мэтадычных курсаў краязнаўства, што ў нядзелю, 1 красавіка, будуць [illegible]чытаны наступныя лекцыі:

1) Праф. М. Н. Гайдукова на тэму—[illegible]бывучэньне флёры краю", 2) С. Жураўскага аб „Фэнолёгічных назіраньнях".

Пачатак заняткаў роўна а 11 з пал. раніцы.

Уваход вольны і не для сяброў т-ва краязнаўства.

(Заняткі адбываюцца ў актавай залі [illegible]факу БДУ).

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— У нядзелю, 1 красавіка—працяг агульна-гарадзкой канфэрэнцыі саюзу працаасьветы.—Даклад НКА т. Баліцкага.

Пачатак а 9 гадзіне раніцы.

— У нядзелю, 1 красавіка, а 7 гадз. увечары адбудзецца зачынены сход яч КП(б)Б працаасьветы па распрацоўцы пастановы 15 зьезду УсеКП(б).

— Сёньня, 31-III, у Доме Асьветы а [illegible] увеч. ДРУГІ РАЗ склікаецца агульны сход сяброў жыльлёва-будаўнічага ка[illegible] «Працаўнік Асьветы» для [illegible] заяваны і перавыбараў [illegible]

[illegible]ніка—два кіно-сэ[illegible]ра.

НОВЫЯ КНІГІ.

Выйшлі з друку і паступілі ў рэдакцыю газ. „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кнігі:

1. «Вестник иностранной литературы» № 3 за 1928 г. Стр. 159, цана 1 руб. Дзяржаўнага Выдавецтва. Масква.

2. „Новый Восток" кніга 20-21 за 1928 г. Стр. 502, цана 3 руб. 50 кап. Выд. Навуковай Асоцыяцыі Ўсходазнаўства Саюзу ССР.

3. «Сьпявай, вясна», В. Сташэўскага. Стр. 28, цана 20 кап.. [Камэдыя ў 2-х дзеях] Беларускага Дзярж. Выдавецтва.

Паштовая скрынка.

Мас'у, Калінкавічы, Маз. акр. Ваш допіс наконт „вялікага зава» Пяльковіча пераслалі ў Наркамасьветы, бо спрэчкі паміж настаўнікамі мы ня друкуем. Раім зьвярнуцца таксама ў свой мясцоў саюзу.

ХРОНІКА.

Зубаўрачэбная паліклініка Чырвонага Крыжу.

Цэнтральны Камітэт Беларускага Т-ва Чырвонага Крыжу пастанавіў адчыніць у Менску зубаўрачэбную паліклініку. Апошняя будзе аказваць зубаўрачэбную дапамогу шырокім слаям насельніцтва, а таксама будзе падрыхтоўваць новыя кадры працаўнікоў па зубаўрачэбнай справе. Паліклініка мае працаваць у 2 зьмены: раніцы прыём—бясплатны, а вячэрні—за невялікую плату. У паліклініцы будуць працаваць навуковыя работнікі катэдры одонтолёгіі Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту. На адчыненьне паліклінікі Чырвонага Крыж вызначыў 4000 руб. Адчыненьне паліклінікі будзе дастасована да сьвяткаваньня 1 мая. Дырэктарам паліклінікі назначан дацэнт БДУ тав. Старобінскі. У бліжэйшыя часы паліклініка мае быць ператорана ў Дзяржаўны Одонтолёгічны Інстытут.

Дапамога вучням--дзецям беднаты.

Па каштарысу Наркамасьветы сёлета адпушчана 50.000 руб. у фонд дзяцей беднаты, якія навучаюцца ў сямёхгадовых школах. Наркамасьветы даў дырэктывы, каб гэтыя сродкі былі скарыстаны ў першую чаргу на харчаваньне, вопратку і абутак.

Перасяленьне працоўных яўрэяў ў Бірска-Біджанскі райён.

Гэтымі днямі закончыўся пленум Беларускага „Азэту", на якім абмяркоўвалося пытаньне аб перасяленьні працоўных яўрэяў у Бірска-Біджанскі райён.

Сёлета ў гэты край будзе перасялена з БССР 180 сем'яў і 60 адзіночак-яўрэяў. Перасяленны паедуць 2 партыямі, прычым першая партыя выедзе ў красавіку.

Пры камплектаваньні партый будзе зьвернута ўвага на падбор працаздольных людзей. У першую чаргу будуць набірацца тыя сем'і, членамі якіх зьвяляюцца розныя рамесьнікі.

Калектыўнае будаўніцтва ў Менскай акрузе.

Сёлета ў Менскай акрузе мае быць арганізавана: 40 с.-г. калектываў, 32 масларобныя арцелі, 2 кантрольныя саюзы, 3 садова-гароднія, 3 насеннаводныя, 15 машынных, 55 мэліярацыйных, 5 агнятрывалага будаўніцтва, 2 пчалярскія і інш. Усяго будзе арган завана звыш 180 розных аб'яднаньняў.

Пашырэньне Менскай тэлефонна-тэлеграфнай станцыі.

Сёлета рамонтныя работы па пераабсталяваньні тэлефонна-тэлеграфных ліній у Менскай акрузе пачнуцца з 1-га мая. У Менску сёлета будзе закончана падвеска паветраных кабеляў. Апроч таго, на тэлефоннай станцыі будуць дадаткова ўстаноўлены 3 новыя каммутатары для павялічэньня колькасьці абонэмэнтаў.

Для хутчэйшай дастаўкі тэлеграм і сьвешных лістоў адрасатам Менская паштова-тэлеграфная кантора мае атрымаць некалькі вэлёсыпедаў.

СУД.

„Абаронцы" сялянскай беднаты.

Дзіўныя справы рабіліся амаль 2 гады ў Янушкоўскім с.-г. т-ве і ад гэтых «спраў» часта прыходзілася пакутаваць беднаку.

Два гады таму назад Белсельбанк у в. Янушковічы, Лагойскага раёну, адчыніў кредытнае т-ва. Пачаўся запіс у сябры т-ва: паваліла беднота, пасыпаліся ўступныя і паявы ўзносы. Беднота пешылася, а кулакі і гандляры пагледзілі з-за вугла і пасьмейваліся.

Кожнаму вядома, што кредытныя т-вы на мясцох адчыняліся для таго, каб вызваліць беднату ад кулака, каб у першую чаргу пры даванозе доўгатэрміновага кредыту даць магчымасьць сялянскай беднаце падняць, узмацніць і больш культурна паставіць гаспадарку, набыць лепшыя земляробныя прылады і скаціну.

Інакш на гэту справу глядзелі кіраўнікі т-ва—старшыня праўленьня Кастусь Юрцэвіч і рахункавод Сьцяпан Кіркевіч: іх праца была карысна кулакам, гандлярам-прыватнікам, арандатарам млыноў і ўласьнікам смалярных заводаў, а беднота стаяла ў хвасьце.

Калі Белсельбанк адпусьціў значную суму на доўгатэрміновы кредыт беднякоў, Юрцэвіч і Кіркевіч скарысталі гэты кредыт часткай на выдачу пазык бедаце, а значная сума пайшла на кредытаваньне гандляроў, арандатараў млыноў, уласьнікаў смалярняў і кулакоў.

Часамі беднякі, будучы ў кредытным т-ве, глядзелі, як багатыры разьбіраюць кредыт, а ім прыходзілася быць толькі сьведкамі і ісьці дамоў з пустымі рукамі.

Урэшце, насыпаліся скаргі, і злоўжываньні Юрцэвіча і Кіркевіча і іх прыхільнасьць да заможных і гандляроў рэвізіяй Белсельбанку была ўстаноўлена.

На судзе Юрцэвіч і Кіркевіч імкнуліся зьмешыць сваю віну нагаворкай: „На памылках мы вучыліся і вучымся", а нявыдачу кредытаў беднаце тлумачылі баязьню, што яна не ўлясе ў тэрмін пазычаных грошай.

Менскі Акрэдовы Суд прыгаварыў Кастуся Юрцэвіча і Сьцапана Кіркевіча на год і два месяцы зьняволеньня кожнага з суровым адмежаваньнем. Дастасаваўшы амністыю, Суд скараціў ім пакараньне напалову і заключыў вад варту.

Д. Кастроў.

1.320.000 руб.--мясцовай прамысловасьці.

Беларускі Камунальны Банк адпусьціў мясцовай прамысловасьці 1.320.000 руб. кароткa-тэрміновага кредыту.

Паказная сума разьмяркована паміж акругамі наступным чынам: Менскай акрузе—606.000 руб., Віцебскай—350.000 руб., Бабруйскай -100.000 руб., Мазырскай—91.000 руб., Полацкай—85.000 руб., Аршанскай—50.000 руб. і Магілеўскай—35.000 руб.

Вечары пытаньняў і адказаў у менскіх клюбах.

Юрыдычная кансультацыя ЦСПСБ і калегія абаронцаў арганізуе вечары пытаньняў і адказаў па ўсіх галінах савецкага права (працоўнага, грамадзянскага, крымінальнага) у наступных клюбах г. Менску: у клюбе імя Леніна (Зах. чыг.)—31 сакавіка а 6 гадз. вечара; у клюбе харчавікоў—1 красавіка ў 8 гадз. вечара; у клюбе скуранікаў—4 красавіка ў 8 гадз. вечара; у клюбе «Эльвод» (заводы «Энэргія» і «Восход»)—4 красавіка ў 7 гадз. вечара; у клюбе прац. асьветы—5 красавіка а 8-й гадз. вечара; у клюбе будаўнікоў—6 красавіка ў 8 гадз. вечара; у клюбе імя Ільліча [МББ чыг.]—6 красавіка а 7-й гадз. вечара; у клюбе „Эльвод" [электрастанцыя]—8 красавіка а 7-й гадз вечара; у с.-г. майстэрнях імя Бурбіса [завод «Металл» і с-г. майстэрні]—25 красавіка ў 7 гадз. вечара.

Гэтыя вечары пытаньняў і адказаў арганізуюцца для рабочых і служачых, ахопленых памянёнымі клюбамі, і іх утрымаецца.

Культурныя навіны.

РОЛЯ «НАШАЙ НІВЫ» Ў ВЫВУЧЭНЬНІ БЕЛАРУСІ.

Зараз ЦБ краязнаўства праводзіць вывучэньне ролі беларускага часопісу адраджэнцкага пэрыяду «Наша Ніва» ў справе зарадзьбіньня краязнаўчага руху на Беларусі. На старонках «Нашай Нівы» закраналіся пытаньні аб стане хатніх рамёстваў, зьбіраўся бюджэт беларускага селяніна, вывучалася народнае мастацтва і інш.

Вывучэньні гэтых матар'ялаў пры параўнаньні з сучаснымі досьледамі даюць вельмі каштоўныя паказьнікі ўзросту эканамічнага і культурнага стану нашага сялянства.

КУЛЬТУРНАЯ СУВЯЗЬ З ЗАМЕЖАМІ.

Беларуская Дзяржаўная Бібліятэка за апошнія часы ўстанавіла пачыльную сувязь па абмену выданьнямі з многімі замежнымі навуковымі ўстановамі. Нядаўна Бібліятэка атрымала ад Інстытуту Усасьветнай Гаспадаркі, які знаходзіцца пры Кільскім Унівэрсытэце, пэрыядычныя выданьні Інстытуту за мінулы год.

225 замежных плугоў для мэліярацыі.

Цэнтраземсклад атрымаў з-за межаў 225 плугоў для апрацоўкі балот. Гэтыя плугі ўжо разьмяркованы паміж мэліярацыйнымі таварыствамі.

Загатоўка насеньня лёну.

Белсельбанк адпусьціў 99.000 руб. Белсельсаюзу спэцыяльна на загатоўку насеньня лёну. Закупленае насеньне будзе завезена непасрэдна ў акругі з ільнаводнымі райёнамі.

Арганізацыя рамонтных майстэрняў.

Для абслугоўваньня сялянскай гаспадаркі ў Гомельскай акрузе распачата арганізацыя рамонтных майстэрняў. Майстэрні арганізуюцца ў Брагіне, Ветцы, Будзе-Кашалёвай, савецкай гаспадарцы «Новасёлкі», Новабеліцы, Дабрушы, Камарыне, Насовічах, Лоеве, Нова-Кузьнечнай і Дняпроўскай камунах, Рэчыцы, Церахоўкі, Падабране, Горвалі, Марковічах, Уваравічах, Хойніках і Чачэрску. 1-га мая гэтыя майстэрні пачнуць працаваць. Для набыцьця абсталяваньня і прыладаў памяшканьняў пад майстэрні і сыравіны сельска-гаспадарчы банк даў кредыт на суму 36 тысяч руб.

КІНО.

кіно-сыск.

(„Кровавый след").

Гэты «арыгінальны» у лапках амэрыканскі баявік мае ў сабе некаторую долю арыгінальнасьці. Арыгінальнасьць фільму ў тым, што сюжэт яго ня зусім шаблённы. Аднак, „арыгінальным" мусіў назваць яго таму, што ў фільме захаваліся да тонкасьці ўсе традыцыйныя прыёмы амэрыканскіх кіно-рэжысэраў у справе падачы сюжэту.

Самыя шматлікія і зусім нечаканыя прыгодзінкіі зваротны гэроэў, бясконцыя і зусім недарэчныя трукі, каб і ня ведаў чые вытворчасьці фільм, дадуць зразумець, што ён амэрыканскі.

Каб выратаваць фільм і хапя трохі захаваць гледача, які канчаткова зьняверыўся ў амэрыканскіх камэдыях, на афішах пішуць: „арыгінальная кіно-п'еса" і гэтым уваходзяць у заблуджэньне.

Калі ў гэтай „камэдыі" і знаходзіш сьмешнае, дык таму, што паказана яно да сьмеху недарэчна і шаблённа. Вядомы злодзей-рэцыдывіст хоча забіць сцэнарыста, які выкрыў у фільме „Крывавы сьлед" усю злачынную дзейнасьць пры аграбленьні банку. Злодзей выняў з тростачкі шпагу. Сцэнарыст (артыст Тодар Фон-Эльта) схапіў палена і, зразумела, перамог злодзея: высіў з рук шпагу, ударыў па галаве, а сам схаваўся. У жыцьці гэтага ніколі ня было і ня будзе, але ў гэтым месцы сьмеешся з недарэчнасьці і шаблёну, з якім вырашаў справу рэжысэр.

Тэхнічная нарадча кадраў, ігра артыстаў, асабліва Тэодара Фон-Эльта і Мэры Астэр, могуць служыць добрым прыкладам.

С. As.

ШАШКІ № 2.

Пад рэдакцыяй А. Каспэрскага.

Станэвішча пасьля 6-га ходу чорных партыі, ігранай па перапісцы ў 1927 г. (з журнала 64 № 5) Бел. Бліштэйн і Шэбедзеў. Чорн. П. Перэльман.



Бел. Бліштэйн і Шэбедзеў. Чорн. П. Перэльман.

1. c3-b4 f6-e5, 2. e3-f4 g7-f6, 3. b2-c3 b6-c5, 4. b4-a5 c5-d4 ход лічылі пройгрышам дзеля чорных. 5.c3-b4 d4-e3! 6. f2:d4 e5:c3, 7. b4-c5 (калі d2-e3, то h8-g7! 8. b4:d2 c7-d6, 9. a5:e5:f6:h4 з роўнай гульнёй.

Калі 7 g3-h4, то c3-b2! 8. a1:c3 f6-g5, 9. h4:f6 e7:e3, 10. d2:f4 h4 g5, 11. f4:h6 f8-g7, 12. h6:c5 c7-b6 13. a5:c7 d8:b2 з лепшай гульнёй). 7...d6:b4, 8. a3:c5 c3-b2! 9. c1:a3? (Трэба было a1:c3). 9...f6-d5! Белыя здаліся. (Заўвагі Перэльмана з журнала «64» № 5).

ШАШАЧНАЯ І ШАХМАТНАЯ ХРОНІКА.

Менск. Спаборніцтвы на прафсаюзах заканчваюцца, вылучаны каманды.

Па саюзу транспартнікаў:

Шашкі: 1) Бэрман А., 2) Райнфэльд, 3) Фрыдман, 4) Гордзін, 5) Ерманскі, кандыдат Гольдберг.

Шахматы: пэрсональна. 1) Олькос, 2) Бэрман А., 3) Ізраілевіч, 4) Альтшулер і 5) Літвінаў, кандыдат Маркевіч.

На жаночыя спаборніцтвы Шмуклер.

Па саюзу будаўнікоў:

Шашкі: 1) Эцінгер, 2) Лібэрман, 3) Цырлін, 4) Лукаш, 5) Зыслін, кандыдат Тайц.

Шахматы: 1) Штэйн М., 2) Годунько, 3) Сьленцін, 4) Родоў.

Па саюзу прац. зямлі і лесу.

Шашкі: 1) Уманская Х., 2) Сайкоўскі, 3) Хроменкаў, 4) Стадніцкі, 5) Батко, кандыдат Чырэвіч.

Шахматы: 1) І. Каспэрскі, 2) Кобец, 3) Фёдараў, 4) Зарэмба, 5) Бедэрсон, кандыд. Іткін.

Віцебск. У шахматным чэмпіянаце па першых месцах Сіліч і Тышлер па +11 з 12. Хто пераможа залежыць ад астатніх 4-х партый; далей Гейман +9.

Пачаліся камандныя спаборніцтвы на 10 прафсаюзах; удзел прымае каля 70 ігракоў.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену Грамадзянскага Кодэксу БССР у рэдакцыі 1927 г.

На падставе атрыкулу 2 пастановы III сэсіі ЦВК БССР IV скліканьня за 26 ліпеня 1923 г. «Аб парадку ўнясеньня зьмен у кодэксы, зацьверджаныя ЦВК Беларусі» (З.З. БССР 1923 г., № 13-14, арт. 115) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць запісаць у Грамадзянскі Кодэкс БССР у рэдакцыі 1927 г. замест артыкулаў 359-403 артыкулы 359-366 у наступнай рэдакцыі:

„359. Акцыйным таварыствам прызнаецца таварыства з асобнаю назваю (фірмаю), якое мае статутны капітал, падзелены на пэўны лік роўных частак (акцый, паёў), і якое адказвае па сваіх абавязнасьцях толькі маемасьцю таварыства.

360.—Кожная акцыя альбо пай акцыйнага таварыства ня можа быць менш за 50 рублёў.

361. Парадак адчыненьня і дзейнасьці акцыйных таварыстваў устанаўліваецца «Палажэньнем аб акцыйных таварыствах", зацьверджаным ЦВК і СНК СССР 17-га жніўня 1927 г. (З.З.СССР 1927 г., № 49, арт. арт. 499 і 500), і наступнымі правіламі.

362. Статуты акцыйных таварыстваў, непрадугледжаныя артыкуламі 12 і 13 «Палажэньня аб акцыйных таварыствах", калі кіраўніцтвы гэтых акцыйных таварыстваў знаходзяцца ў межах БССР, падаюцца іх закладчыкамі на зацьверджаньне Эканамічнае Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР; праз Народны Камісарыят Фінансаў, калі таварыства займаецца крэдытнымі альбо страхавымі аперацыямі, праз Вышэйшы Савет Народнае Гаспадаркі, калі таварыства мае прамысловую мэту, і праз Народны Камісарыят Гандлю—ва ўсіх іншых выпадках. Зьмены гэтых статутаў, непрадугледжаныя артыкуламі 12 і 13 «Палажэньня аб акцыйных таварыствах», зацьверджаюцца тым самым парадкам.

Увага. Тыя артыкулы зацьверджаных Эканамічнаю Нарадаю пры Савеце Народных Камісараў БССР статутаў, якія розьняцца ад чыннага заканадаўства БССР, павінны зацьверджацца Саветам Народных Камісараў БССР.

363. Статуты акцыйных таварыстваў, зацьверджаныя Эканамічнаю Нарадаю пры Савеце Народных Камісараў БССР, публікуюцца ў адзеле II па «Збору Законаў і Загадаў Рабоча-Сялянскага Ураду БССР», а пра зацьверджаньне акцыйных таварыстваў паводле артыкулу 362 і пра іх ліквідацыю публікуецца за кошт іх закладчыкаў у газэтах «Экономическая Жизнь» і „Савецкая Беларусь".

364. Калі па працягу трох год пасьля ліквідацыі акцыйнага таварыства крэдыторы таварыства не запатрабуюць сум, якія, паводле артыкулу 119 „Палажэньня аб акцыйных таварыствах", будуць унесены ў дэпазыт суда, то гэтыя сумы залічваюцца ў даход дзяржавы.

365. Для ўдзелу ў іскавых справах акцыйнага таварыства, на скончаньні да сьпіньня дзейнасьці ліквідацыйнае камісіі, агульны сход членаў акцыйнага таварыства, які скліканы для разгляду ліквідацыйнае справаздачы і заключнага ліквідацыйнага балянсу (арт. 122 „Палажэньня аб акцыйных таварыствах"), можа выбраць сваіх прадстаўнікоў.

366. Калі пасьля задавальненьня пратэзіі да акцыйнага таварыства, неразгледжаных судом да сьпіньня дзейнасьці ліквідацыйнае камісіі (арт. 118 „Палажэньня аб акцыйных таварыствах") будзе астатак сум, альбо калі акцыйнаму таварыству будуць прысуджаны якія-небудзь сумы, то выбраныя паводле артыкулу 365 прадстаўнікі па ўгадненьні, у залежнасьці ад меты таварыства (арт. 361), з народнымі камісарыятамі [illegible] альбо [illegible]ендаю ці з Вышэйшым Саветам Народнае Гаспадаркі [illegible]мяркоўваюць гэтыя сумы паміж акцыянерамі».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

1 сакавіка 1928 г.
г. Менск.

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

аб скасаваньні арт. 99 Палажэньня аб судабудаўніцтве.

У зьвязку з пастановай Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Саюзу ССР за 21 сьнежня 1927 г. „Аб пераводзе ватарыяльных органаў на дзяржаўны бюджэт" (З. З. СССР 1928 г. № 2, арт. 12), Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Скасаваць арт. 99 «Палажэньня аб судабудаўніцтве БССР" (З.З. БССР 1925 г. № 49, арт. 382).

2. Гэтую пастанову ўвесьці ў дзейнасьць з 1-га кастрычніка 1928 г.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

8 сакавіка 1928 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

об изменении Гражданского Кодекса БССР в редакции 1927 г.

На основании статьи 2 постановления III сессии ЦИК БССР IV созыва от 26 июля 1923 года „О порядке внесения изменений в кодексы, утвержденные ЦИК Белоруссии" (С. У. БССР 1923 г. № 13-14, ст. 115) Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют внести в Гражданский Кодекс БССР в редакции 1927 года взамен статей 359-403 статьи 359-366 в следующей редакции:

«359. Акционерным обществом признается общество с особым наименованием (фирмой), имеющее уставный капитал, разделенный на определенное число равных частей (акций, паев) и отвечающее по своим обязательствам только имуществом общества.

360. Каждая акция или пай акционерного общества не может быть менее 50 рублей.

361. Порядок открытия и деятельности акционерных обществ устанавливается «Положением об акционерных обществах», утвержденным ЦИК и СНК СССР 17 августа 1927 года (С. З. СССР 1927 года, № 49, ст. ст. 499 и 500), и следующими правилами.

362. Уставы акционерных обществ, непредусмотренные статьями 12 и 13 «Положения об акционерных обществах», если правления этих акционерных обществ находятся в пределах СССР, представляются их учредителями на утверждение Экономического Совещания при Совете Народных Комиссаров БССР; через Народный Комиссариат Финансов, если общество занимается кредитными или страховыми операциями, через Высший Совет Народного Хозяйства, если общество имеет промышленную цель, и через Народный Комиссариат Торговли—во всех остальных случаях. Изменения этих уставов, непредусмотренные статьями 12 и 13 „Положения об акционерных обществах", утверждаются в том же порядке.

Примечание: Те статьи утвержденных Экономическим Совещанием при Совете Народных Комиссаров БССР уставов, которые отличаются от действующего законодательства БССР, должны утверждаться Советом Народных Комиссаров БССР.

363. Уставы акционерных обществ, утвержденные Экономическим Совещанием при Совете Народных Комиссаров БССР, публикуются во II отделе «Собрания Законов и распоряжений Рабоче-Крестьянского Правительства БССР", а об утверждении акционерных обществ согласно статьи 362 и об их ликвидации публикуется за счет их учредителей в газетах «Экономическая Жизнь» и „Савецкая Беларусь".

364. Если в течение трех лет после ликвидации акционерного общества кредиторы общества не потребуют сумм, которые согласно статьи 119 «Положения об акционерных обществах" будут внесены в депозит суда, то эти суммы зачисляются в доход государства.

365. Для участия в исковых делах акционерного общества, незаконченных до прекращения действий ликвидационной комиссии, общее собрание членов акционерного общества, созванное для рассмотрения ликвидационного отчета и заключительного ликвидационного баланса (ст. 122 «Положения об акционерных обществах»), может выбрать своих представителей.

366. Если по удовлетворении [illegible] к акционерному обществу, нерасс[illegible] судом до прекращения деятельно[illegible] ликвидационной комиссии (ст. 118 об акционер[illegible] остаток сумм [illegible] обществу будут пр[illegible] суммы, то выбранн[illegible] представители по с[illegible] мости от цели [illegible] ными комиссариат[illegible] товля или с Высш[illegible] Хозяйства распреде[illegible] акционерами».

Председатель Цен[illegible] тельного Комите[illegible]
Председатель Совета [illegible] саров БС[illegible]
Секретарь Цен[illegible] тельного Комитета [illegible]
г. Минск. 1 марта [illegible]

ПОСТАНО[illegible]

Центрального [illegible] Комитета и Сов[illegible] Комиссар[illegible]

об исключении ст. 99 [illegible] устро[illegible]

В связи з постановле[illegible] Исполнительного Комит[